№№83–84
(2603–2604)

25 мая 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Да ўвагі!

Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Наведвайце сайт «Народнай волі»!

Паважаныя чытачы "Народнай волі"!
Знайсці нас у Інтэрнеце можна па адрасе **www.nv-online.info**
Там вы зможаце прачытаць артыкулы апошніх нумароў газеты і абмеркаваць іх, даведацца пра падзеі ў краіне і свеце на стужцы навін, напісаць электронны ліст у рэдакцыю.
Архіў газеты можна паглядзець па адрасе **http://nv.promedia.by**

ПАЛІТЫКА

Як ні шчаміліся — не пралезлі

Як вядома, Беларусь не прайшла ў Савет ААН па правах чалавека. Членамі Савета ад Усходняй Еўропы сталі Славенія і Боснія і Герцагавіна.

У першым туры за Славенію прагаласавалі 168 са 190 дзяржаў, за Боснію і Герцагавіну — 95, за Беларусь — 78 (для абрання ў савет краіна-кандыдат павінна набраць не менш за 97 галасоў). У другім туры за Боснію і Герцагавіну прагаласавалі ўжо 112 дзяржаў, за Беларусь — 72.

Нагадаем, што да апошняга Беларусь разлічвала стаць членам галоўнай праваабарончай структуры ў свеце. Справа ў тым, што на два месцы ад Усходняй Еўропы было толькі два прэтэндэнты. Здавалася б, пытанне для беларускай дыпламатыі вырашана. Але ў адказ на заклік сваякоў зніклых у Беларусі палітыкаў не прымаць Беларусь у склад Савета ААН па правах чалавека, бо гэта здзек і цынізм, паколькі ў краіне гэтыя самыя правы грамадзян зневажаюцца, адгукнуліся праваабарончыя арганізацыі і грамадскія дзеячы з усяго свету. Пачалася сапраўдная міжнародная грамадская кампанія супраць уключэння Беларусі ў склад Савета ААН. Вынікам якой стала тое, што сваю кандыдатуру ў склад праваабарончай структуры ААН ад Усходняй Еўропы прапанавала яшчэ адна краіна — Боснія і Герцагавіна. Яна і была абрана большасцю галасоў.

Амерыканская газета "New York Times" прыводзіць каментарый Стыва Кроўшау — прадстаўніка праваабарончай арганізацыі Human Rights Watch, якая напярэдадні галасавання заклікала ўдзельнікаў Генасамблеі не аддаваць свае галасы за Беларусь. *"Парушальнікі правоў чалавека не могуць быць сябрамі Савета ААН"*, — заявіў Стыў Кроўшау.

Алег СНОЎ.

ЗАКУЛИСЬЕ

Домашкевич остается или уходит?

В кулуарах Администрации президента говорят, что во время совещания по вопросам социально-экономического развития страны "губернатору" Минской области **Николаю Домашкевичу** настоятельно порекомендовали подыскивать другую работу. А через некоторое время, комментируя очередные кадровые назначения, Александр Григорьевич заметил: мол, на должность председателя облисполкома не можем найти человека. И добавил: *"Никаких назначений на "отсидку", как это было во времена Советского Союза, не будет. Мы должны привлекать новые, молодые кадры"*. После этого появилась новость о том, что Домашкевич якобы написал заявление об уходе... в отпуск, а на его место будто бы совсем скоро придет молодой и перспективный руководитель.

А вот помощник председателя Миноблисполкома **Раиса Ясинская** призывает не верить слухам об уходе Домашкевича.

"Вы не поддавайтесь слухам, надо смотреть телевидение, и если президент объявит, что Домашкевича освободили, или в газете об этом напишут, вот тогда надо и верить, и писать, — сказала Раиса Викторовна "Народной воле". — *Никаких отставок нет. Губернатор как работал, так и будет работать. Николая Федоровича никто ни в какую отставку не отправлял, от должности не освобождал. Он работает на своей должности. А что касается отпуска, то когда ему президент график утвердит, тогда он и пойдет".*

Когда у Домашкевича по графику запланирован отпуск, Раиса Викторовна уточнять не стала. Хотя, если верить тем же слухам, то разрешение на отпуск Домашкевич уже получил.

А там посмотрим...

Марина КОКТЫШ.

Министр обещает и намекает

Возможное повышение тарифов ЖКХ для населения произойдет не раньше 2008 года. По крайней мере, это пообещал министр жилищно-коммунального хозяйства Беларуси Владимир Белохвостов.

Однако радоваться рано. Министр хорошо усвоил, что больше чем на 5 долларов в год повышать тариф на ЖКХ он не может. Однако нашлась другая лазейка. В воде... Белохвостов честно признался: "Министерство ЖКХ будет инициировать повышение тарифов на воду, ведь сегодня один кубический метр ее обходится всего лишь в 257 рублей, что приводит к бесхозяйственности. Нужно, чтобы этот важный ресурс стоил соответственно".

Лилия ВОРОНОВА.

*Са зваротам да Кангрэса дэмакратычных сіл звярнулася незарэгістраваная "Еўрапейская кааліцыя", у склад якой уваходзяць паплечнікі **Мікалая Статкевіча** і **Уладзіміра Навасяда**, а таксама незарэгістраваны "Малады фронт".*

Выбар свабоды — гэта еўрапейскі выбар!

26—27 мая павінен адбыцца Кангрэс дэмакратычных сіл. Асноўная ўвага ініцыятараў Кангрэса засяроджана на пытанні кіраўніцтва Аб'яднанымі дэмакратычнымі сіламі (АДС). Між тым па-за сур'ёзным абмеркаваннем засталася стратэгія АДС, што з'яўляецца першасным і вызначае ў тым ліку патрабаванні да кіраўніцтва АДС. Праект стратэгіі, прапанаваны планава-аналітычнай групай, заснаваны на спадзяваннях на эвалюцыю рэжыму ў бок дэмакратыі. Асноўны акцэнт у ім зроблены на перамовах з уладай. Нягледзячы на яго крытыку нашымі прадстаўнікамі ў Палітычнай радзе, гэты праект выносіцца зараз на зацвярджэнне Кангрэса. "Еўрапейская кааліцыя" мусіць прапанаваць Кангрэсу свой, альтэрнатыўны праект стратэгіі АДС, заснаваны на мабілізацыі актыўнай часткі грамадства вакол ідэі еўрапейскага выбару для рэальнай барацьбы за свабоду Беларусі.

Аналіз, зроблены ў нашым праекце, даказвае, што эвалюцыя рэжыму ў бок дэмакратыі і сур'ёзныя перамовы з ім немагчымыя. Наадварот, яго эвалюцыя адбываецца ў зваротным накірунку, што выразна відаць на прыкладзе аднаго з удзельнікаў Кааліцыі — "Маладога фронту". Калі ў 2005 годзе да крымінальнай адказнасці быў прыцягнуты адзін сябар "МФ", то ў 2006 г. — 2, а ў 2007 г. — ужо 7. Такое неадэкватнае ўзмацненне рэпрэсій супраць маладзёжнай арганізацыі, большасць якой складаюць школьнікі і якая адмаўляе гвалтоўныя метады барацьбы, акрамя лагічнай эвалюцыі рэжыму, мае яшчэ і іншыя прычыны. Згодна з атрыманай намі інфармацыяй, рэпрэсіі супраць "Маладога фронту" ініцыяваны агентурай уплыву суседняй дзяржавы ў асяродку КДБ. Яны маюць на мэце:

— аслабіць патрыятычнае, праеўрапейскае крыло АДС на карысць супрацьлеглага;

— зрабіць пры дапамозе пераследу дзяцей немагчымым паляпшэнне адносін беларускага рэжыму з дэмакратычным Захадам;

— даказаць рэпрэсіямі супраць "страшэннага монстра" — "Маладога фронту" лаяльнасць рэжыму службовых асоб КДБ, якія падазраюцца ў несанкцыянаваных кантактах са спецслужбай суседняй дзяржавы.

Няма неабходнасці называць прозвішчы гэтых асоб — геаграфія рэпрэсій яскрава сведчыць аб іх.

Нягледзячы на рэпрэсіі, "Еўрапейская кааліцыя" будзе і надалей актыўна змагацца за еўрапейскі выбар для Беларусі, за еўрапейскія каштоўнасці, за свабоду. Нельга спадзявацца атрымаць "ярлык" на кіраванне краінай, прадаўшы крыху палітычнага і эканамічнага суверэнітэту. Тым больш што ахвотнікаў падняць цану будзе ўзнікаць усё болей і болей.

Беларусь пастаўлена перад непазбежным цэнасным выбарам — у Еўропу ці ў Азію. Мы будзем патрабаваць ад дэлегатаў Кангрэса публічнага і сумленнага выбару паміж гэтымі альтэрнатывамі, а таксама выбару паміж актыўнай барацьбой і бяздзейнасцю. Ад вынікаў іх выбару будзе залежаць магчымасць нашага аб'яднання з тымі ці іншымі арганізацыямі і палітыкамі.

Ад гэтага выбару залежыць будучыня Беларусі.

Жыве Беларусь!

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Севярынец — на свабодзе!

Пагроза з боку Еўрапейскага Саюза пазбавіць афіцыйны Мінск гандлёвых прэферэнцый коштам прыкладна 400 мільёнаў еўра ў год знайшла нечаканы водгук з боку беларускіх уладаў. Палітвязням паступіла прапанова (каму — праз дыпламатаў, каму — праз праваабарончыя арганізацыі): напісаць заяву аб памілаванні. Па неафіцыйных звестках, заявы з указаннем парушэнняў заканадаўства пры следстве і судзе на імя старшыні камісіі па памілаванні Наталлі Пяткевіч напісалі сваякі, родныя, блізкія, адвакаты Аляксандра Казуліна, Артура Фінькевіча, Андрэя Клімава, Паўла Севярынца...

Прапанова напісаць лісты на імя Пяткевіч прагучала пасля неафіцыйнай сустрэчы высокай чыноўніцы з памочнікам намесніка Дзяржсакратара ЗША Дэвідам Крэмерам у мінскім кафэ "Фрески" за кубачкам кавы. Супадзенне гэта ці не, застаецца толькі здагадвацца. Але пасля гэтай сустрэчы Крэмер паведаміў журналістам, што ЗША запатрабавалі вызвалення ўсіх палітвязняў. *"Мы маем дадатковыя магчымасці для ціску на беларускі ўрад. Але я спадзяюся, што яны не спатрэбяцца"*, — шматзначна паведаміў Крэмер.

Калі ж журналісты ўспомнілі пра славуты Акт аб дэмакратыі ў Беларусі, прыняты амерыканскім Кангрэсам, і пра тое, што гэтым дакументам быў прадугледжаны пошук банкаўскіх рахункаў Аляксандра Лукашэнкі і ягоных паплечнікаў, Крэмер сказаў: "Банкі выканалі загад". Ці азначае гэта, што рахункі знойдзены?.. Ніякіх афіцыйных каментарыяў на гэты конт няма. Але ў любым выпадку, беларускія палітвязні ўпэўнены, што ЗША і Еўропа (пагражаючы эканамічнымі санкцыямі) зараз фактычна выкупляюць палітвязняў з беларускім турмаў. І пры гэтым ставяць адну ўмову: выпусціць абсалютна ўсіх.

Павел Севярынец стаў першым, хто быў датэрмінова вызвалены.

22 мая ў абед гарадскі суд Наваполацка пастанавіў: "за прыкладныя паводзіны" — вызваліць.

Заснавальнік незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт", сустаршыня аргкамітэта па стварэнні Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі быў асуджаны за арганізацыю вулічных дэманстрацый пратэсту супраць фальсіфікацыі вынікаў выбараў і рэферэндуму 2004 года, адбываў пакаранне ў вёсцы Малое Сітна Полацкага раёна.

— Павел, можна віншаваць?

— Так. Кажуць, загад на вызваленне паступіў зверху, таму ўся працэдура заняла хвілін пятнаццаць, не болей...

— Колькі яшчэ заставалася сядзець?

— Літаральна 2 месяцы і 24 дні. Зразумела, у такіх умовах "датэрмінова-ўмоўнага" вызвалення не бывае. Гэта — чыста палітычная справа.

— Як сустрэла свабода?

— Акунуўся ў атмасферу горада Наваполацка. Аказваецца, за два гады ў краіне нічога не змянілася. У першай жа краме папрасіў гарбаты. І ў адказ пачуў: "Пайшоў у ж... беларус хрэнаў і... фашыст". Давялося прасіць кнігу скаргаў. Так што барацьба ўжо пачалася.

У другой краме таксама мяне "не зразумелі", таму пайшоў у трэцюю краму і ўзяў соку.

— На Кангрэс дэмсіл збіраецеся?

— Так, праз дзень (размова адбылася ў аўторак. — **Аўт.**) я накіроўваюся ў Мінск.

— Якія планы надалей?

— У першую чаргу буду дапамагаць Аляксандру Мілінкевічу ствараць ягоны рух "За свабоду!". Буду рабіць Беларускую Хрысціянскую Дэмакратыю — у планах зрабіць БХД буйнейшай партыяй на Беларусі *(на гэтую тэму ў адным з бліжэйшых нумароў "Народнай волі" будзе надрукаваны артыкул П.Севярынца. —* **Рэд.***)*. І, вядома, усяляк буду дапамагаць "маладафрантаўцам". Безумоўна, 28 мая пайду на суд над імі.

Апроч усяго, мяркую аб'ехаць усе гарады, адкуль мне на "хімію" пісалі лісты. Разумею, што гэта будзе нялёгка, але я ўдзячны ўсім, хто падтрымаў мяне ў цяжкія часіны.

— Але ж жыццё, натуральна, не вычэрпваецца палітыкай...

— Так, вядома. Выношваю пэўныя творчыя планы, прынамсі, пішу раман, які цяпер знаходзіцца ў прамежкавай стадыі.

— Якая рабочая назва?

— Пакуль гэта сакрэт. Скажу толькі, раман пра Беларусь...

Глеб ХМЯЛЬНІЦКІ.

МНЕНИЕ

Александр Козулин за коллективное руководство в коалиции

Экс-кандидат в президенты считает, что среди VIP-делегатов Конгресса должны быть Ивонка Сурвилла и Зенон Позьняк.

Александр Козулин, находясь в заключении, постоянно боролся за скорейшее проведение Конгресса объединенных демсил, считая его важнейшим национальным форумом.

На своих последних встречах в колонии с адвокатом И.Рынкевичем и 17 мая на кратковременном свидании с родственниками осужденный экс-кандидат в президенты передал ряд предложений по проведению Конгресса.

Так, в разговоре с родными А.Козулин подтвердил, что выступает за коллективное руководство в коалиции ОДС при личной ответственности каждого лидера за принятое на себя направление общей деятельности. Эффективности управления демсилами будет способствовать проделанные на Конгрессе анализ борьбы, работа над ошибками, поиск путей решения внутренних проблем оппозиции. А это можно сделать, как и ранее предлагал профессор Козулин, при даче честного отчета в докладах лидеров оппозиции и их конструктивном обсуждении.

Со стороны кандидата в президенты, председателя БСДП А.Козулина такой доклад готов сделать его представитель и зампредседателя партии Игорь Рынкевич.

А.Козулин, признавая необходимость оптимизации общей стратегии ОДС, предостерег от продолжения "игры в стратегию", во "фракции и движения": "демсилы так могут залечить проблему до смерти и на потребу властям разъединиться". Как указал А.Козулин, важнее сохранить единство, определить базовые ценности и программу из 5—7 судьбоносных задач, на которых будет строиться вся борьба за приход оппозиции к власти и построение демократической Беларуси. А потому профессор предлагает: *"Если кто-то уже думает, как ему, получая ресурсы, идти после Конгресса своим отдельным путем, то пусть открыто скажет об этом и попробует доказать свою уникальность и победоносность".*

Среди других замечаний А.Козулина выделяется его предложение, чтобы Политсовет ОДС при определении делегатов из "списка VIP-персон" помнил о важности участия в Конгрессе "соли легитимности белорусской власти": демократических депутатов 13 созыва, судей Конституционного суда состава 1996 года и представителей Рады БНР, белорусских диаспор за рубежом. *"Для меня, — заявил Александр Козулин, — все они — VIP-делегаты. На Конгрессе должны быть и Ивонка Сурвилла, и Зенон Позьняк и, при прозрении, министры нынешнего правительства смелее, чем Сидорский".*

Пресс-служба А.В.Козулина.

JOB VACANCY:
BRITISH EMBASSY

The British Embassy in Minsk is seeking to recruit a temporary Entry Clearance Assistant.

Candidates should have initiative, good interpersonal skills, enthusiasm and a high standard of self-presentation. Candidates should be computer literate, and have excellent spoken and written English. Previous, relevant, work experience is desirable.

The position will involve a wide range of work in support of the Entry Clearance Officer's activities. The main purpose of the job is to assist the Entry Clearance Officer in all aspects of visa and Consular work providing a fast, efficient and effective service. This will focus on the following responsibilities: accurately interpreting during interviews and translating supporting documentation when required; responding to written and telephone inquiries appropriately; providing accurate information about entry clearance matters; and clerical support.

Working hours will be from 0900 to 1730 Monday to Thursday and from 0900 to 1500 on Friday.

Applications, including CVs, should consist of no more than two pages, and should be sent to the address below in an envelope marked "Application for Entry Clearance Assistant Vacancy." References may be included. The deadline for applications is 1 June 2007. Selected candidates will be called for interview shortly thereafter. The appointment will commence in June 2007 and last until September 2007. Unsuccessful candidates will not be contacted.

The Management Officer, British Embassy,
37 Karl Marx Street, Minsk, 220030

Мікола СТАТКЕВІЧ: «Выкупляюць, як закладнікаў»

Рашэнне аб вызваленні Міколы Статкевіча прымаў Пухавіцкі раённы суд у прысутнасці пракурора. Прычым ішла відэаздымка, якую вялі людзі з КДБ.

Наконт планаў палітык сказаў "Народнай волі" лаканічна: *"Найперш мушу ўдзельнічаць у Кангрэсе дэмсіл"*. Дадаваць да гэтага што-небудзь Мікола Вікторавіч не стаў. *"Давайце пазней, я зараз у краме — трэба ж развітацца з вяскоўцамі"*, — кажа палітык.

Вестка пра ўмоўна-датэрміновае вызваленне для Міколы Статкевіча стала поўнай нечаканасцю. *"Былі пэўныя намёкі — і толькі. Тым больш што я не пісаў заяву на ўмоўна-датэрміновае вызваленне, не пісаў прашэнне на памілаванне. Адсядзець мне заставалася толькі два месяцы"*, — падсумаваў палітык.

Асобныя палітыкі звярнуліся з просьбамі аб вызваленні на імя старшыні камісіі па памілаванні Наталлі Пяткевіч. Але — не Мікола Статкевіч. *"Я суд не прызнаваў, вінаватым сябе не лічыў і не лічу, ні разу не звяртаўся з просьбай аб умоўна-датэрміновым вызваленні. І наогул да гэтага балюча стаўлюся. Пазней скажуць: прасіўся — памілавалі, а цяпер — зноў бярэшся за старое"...* — кажа Мікола Статкевіч.

Да торгу паміж Еўропай і беларускімі ўладамі (захаваем гандлёвыя прэферэнцыі, калі вызваліце палітвязняў) палітык ставіцца таксама адмоўна. *"Палітвязняў выкупляюць, як закладнікаў. Як беларуску Ірыну Ума-Экспа, якую выкралі нігерыйскія баевікі. Але справа ў тым, што такая практыка можа стаць звычайнай. Спатрэбяцца грошы — улада зноў стане браць закладнікаў"*, — пераканаў Статкевіч.

Нагадаем, Мікола Статкевіч быў асуджаны на два гады зняволення з адбываннем пакарання на "хіміі" за арганізацыю вулічных дэманстрацый пратэсту супраць вынікаў рэферэндуму 2004 года. Пакаранне адбываў спачатку ў Баранавічах, адтуль палітыка перавялі ў вёску Блонь Пухавіцкага раёна пад Мінскам.

Глеб ХМЯЛЬНІЦКІ.

ПРАТЭСТ

Страйк механізатараў

Даведзеныя да адчаю механізатары сельгаскааператыва "Варняны" Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці два дні запар адмаўляліся выходзіць на працу.

Вось што расказаў карэспандэнту "Народнай волі" адзін з механізатараў, які ўдзельнічае ў страйку: *"Зімой у нас заробкі ўвогуле смешныя былі: у каго 50, у каго па 100 тысяч у месяц. Але не бунтавалі, бо зімой заўжды так — працы фактычна няма. А вось калі гарачая пара наступае — пасяўная ці ўборачная, мы працум з сямі ранку да дзевяці вечара. І ўсё б нічога, але кіраўніцтва нас за людзей не лічыць. Нам не выплачваюць прэміі, уразаюць зарплаты, звальняюць. Нядаўна пазбавілі працы аднаго механізатара — чалавек не п'е, гадуе пяцярых дзяцей. Аднак кіраўніцтву не спадабалася, што ён меў свой пункт гледжання, зарплату патрабаваў... Наша кіраўніцтва шле наверх справаздачы па сярэднім заробку: здавалася б, і нядрэнна — 350 тысяч рублёў. Калі начальнік атрымлівае мільён, а просты рабацяга 100 тысяч, то сярэдняя лічба, сапраўды, будзе выглядаць прыстойна..."*

Зразумела, што надзвычайнае здарэнне калгаснага маштабу нарабіла шуму. Чыноўнікі кінуліся ўгаворваць механізатараў: *"Да нас у панядзелак цэлая дэлегацыя прыязджала — начальнік Астравецкага РАУС, намеснік кіраўніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі раёна, некалькі асоб у цывільным. Яны сталі ўгаворваць нас выйсці на працу, абяцалі вырашыць пытанне з зарплатай. Нават пагражалі, што калі мы будзем заклікаць далучыцца да страйку іншых, то супраць нас можа быць узбуджана крымінальная справа"*.

Ці то пагрозы падзейнічалі на людзей, ці то яны хочуць верыць абяцанням, але пратэстны запал як успыхнуў, так і патух. На другі дзень страйку колькасць бастуючых зменшылася: *"На пачатку ў страйку брала ўдзел больш за сорак чалавек. А сёння, у аўторак, засталося дваццаць. Астатнія павыходзілі на працу... Але тыя, хто бастуе і зараз, ад сваіх патрабаванняў адмаўляцца не збіраюцца. Галоўнае: мы патрабуем, каб з пасады старшыні сышоў Уладзіслаў Рук, бо працаваць пад яго кіраўніцтвам далей немагчыма"*.

Датэлефанавацца да кіраўніка "Варнянаў" Уладзіслава Рука, каб пачуць ягоную версію здарэння, у аўторак, перад здачай нумара газеты ў друк, не ўдалося. Яго тэлефон упарта не адказваў. У Астравецкім райвыканкаме сітуацыю таксама праясніць не здолелі. Але па неафіцыйнай версіі, са спадаром Рукам зараз будуць сур'ёзна разбірацца, у першую чаргу з-за таго, што дапусціў надзвычайную сітуацыю.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

Астравіцкі раён.

Народная Воля http://www.nv-online.info
25 МАЯ 2007 г.

ОСТРЫЙ ВЗГЛЯД

Мы стоим на краю пропасти

Все, что вы прочтете в этом письме, многие могли уже где-то прочитать или услышать. Я лишь, не претендуя на беспристрастность и научную точность, хочу поделиться своим взглядом на состояние дел в нашей стране и обществе. Оно, по моему мнению, достаточно трагично. Лукашенко и правительство не имеют четкой стратегической линии развития страны и занимаются всего лишь латанием дыр, которых становится все больше и больше. При существующей бесперспективной системе хозяйствования общество и мораль неминуемо приходят в упадок.

Обычные человеческие чувства и качества — любовь, дружба, честность, порядочность — приносятся в жертву Молоху наживы, стяжательства, властолюбия. Не чиновники управляют государством (они всего лишь пешки, независимо от ранга) и не президент, хотя ему какую-то роль отводят и поддерживают в нем иллюзию, что он первое лицо государства. Правят умные, хитрые, циничные, беспринципные, потерявшие человеческую сущность типы, для которых люди перестали быть людьми, а превратились в материал, необходимый для достижения цели и поддержания собственной жизнедеятельности. Души у них нет, и это слово для них лишь пустой звук, способный вызвать разве что снисходительную улыбку, а ненависть к людям, сохранившим ее, безмерна, и изобретательность по уничтожению таких людей не знает границ. Они не имеют национальной принадлежности, не признают никаких законов, и власть их почти безгранична.

Мы вплотную приблизились к построению такого государства, где нормальный человек не будет иметь ни единого шанса остаться человеком. Наша страна стоит сейчас на краю пропасти, и экономическая пропасть еще далеко не самая страшная. Страшнее всего потеря нравственности, способности к сопротивлению, когда человек шаг за шагом сдает свои позиции; набирает воды в рот, когда надо и хочется говорить; выполняет преступные и унизительные приказы, понимая, что этого делать нельзя; наступает на горло собственной совести.

Но это еще не все. Идет работа не только по расшатыванию человеческих устоев общества, но и по уничтожению этнической сущности белорусского народа, превращению его в непонятное аморфное образование, не способное на самостоятельное существование. Белорусская культура существует на уровне самодеятельных энтузиастов. На телеэкране буйство посредственности, в литературе за последние годы не появилось ни одного сколько-нибудь значимого произведения. Все, кто хотя бы немного представляет какую-то ценность, или покупаются и становятся безликими и послушными исполнителями, или изгоняются, предварительно измазанные и извалянные в дерьме. Многие из них не вернутся никогда. Нация лишается лучшей своей части, обедняется и уничтожается наш генофонд.

Нация планомерно и неуклонно деградирует. Пройдет несколько поколений, и слово "белорус" можно будет забыть. Правящий режим этого нарастающего кома не остановит и остановить не может, так как сам в сущности является частью этого процесса.

Я обращаюсь к оппозиционным политикам. Забудьте внутри- и межпартийные дрязги, мелкие политические амбиции и меркантильные интересы. Определите в своей среде самого достойного и работайте на него и на общее дело. Время шатаний и шараханий давно прошло, пришло время принимать решения и действовать. Если вы промедлите и не сделаете этого, вы сами выкопаете себе могилу и утащите в нее за собой всех, кто вам еще пока верит.

Сергей ОДИНЕЦ,
житель Борисова
(адрес временный).

ОТ РЕДАКЦИИ

Письма, в которых нет конкретных фактов, мы обычно откладываем в сторону. Но это решили напечатать. Для того, чтобы через читателей проверить, прав автор или нет, имеет ли он резон так категорично смотреть на жизнь или реалии не совсем такие, как представляет их Сергей Александрович Одинец.

Вступайте в дискуссию, уважаемые читатели. "Народная воля" — ваша газета, ее страницы — ваши страницы. Глубокое, всестороннее обсуждение волнующих проблем позволит не только обнажить все наши болячки, но и найти лекарство для их лечения.

Словом, личное мнение Сергея Одинца вам известно. А вы что скажете?

ЭШЕЛОНЫ ВЛАСТИ

Юрий Бородич не хочет говорить об изменении избирательного законодательства

Недавно А.Лукашенко присвоил председателю центрального совета Республиканского государственно-общественного объединения "Белорусское физкультурно-спортивное общество "Динамо" Юрию Бородичу звание генерал-майора. Этот факт спровоцировал массу слухов.

Юрия Бородича генеральские погоны наверняка обрадовали больше, чем когда-то успехи олимпийской хоккейной сборной...

В чиновничьих кругах сразу заговорили о том, что Бородича, вероятно, в ближайшее время ждет очередное назначение: мол, просто так на таких должностях генеральские погоны не получают. Если верить людской молве, то Бородича могут либо перевести в Совбез в подчинение к помощнику президента по национальной безопасности **Виктору Лукашенко,** либо назначить председателем Государственного таможенного комитета, которым, по официальным сообщениям, в ближайшее время намерен серьезно заняться Госконтроль.

Кстати, разговоры о назначении Бородича руководителем ГТК ходили и несколько лет назад, когда он только вернулся из Москвы, где с декабря 1998 года по июнь 2004 года работал официальным представителем КГБ Беларуси при ФСБ России и Антитеррористическом центре СНГ. Однако главным таможенником сделали **Александра Шпилевского.** А Бородич возглавил БФСО "Динамо". Почти через год после этого назначения Юрий Федорович вошел в так называемый "ближний круг" — его избрали заместителем председателя Президентского спортивного клуба, который возглавляет **Дмитрий Лукашенко**. По неофициальной информации, Бородич играет в хоккей вместе с Лукашенко и его сыновьями...

"Народная воля" попросила Юрия Федоровича подтвердить или опровергнуть слухи о его предполагаемом уходе с должности.

В телефонном разговоре новоиспеченный генерал-майор сказал: *"Я никогда слухам не верил. Я выполняю те задачи, которые мне предписаны".*

На другие вопросы Юрий Бородич отвечать отказался.

"Я интервью не даю. Если хотите со мной пообщаться, мы можем найти время и пообщаться, только надо согласовать этот вопрос с советником, который у меня непосредственно взаимодействует со средствами массовой информации", — предложил Бородич.

Советник Бородича **Александр Мушта** попросил выслать предварительные вопросы для интервью. И предупредил, что в списке ни в коем случае не должно быть вопросов, касающихся, например, внесений изменений в Избирательный кодекс, и тому подобных.

Напомним, что Юрий Бородич был одним из тех, кто 12 апреля 1995 года руководил избиением оппозиционных депутатов, проводивших голодовку в зале заседаний Верховного Совета Беларуси. По словам очевидцев, он руководил одной из групп вооруженных людей. По его приказу депутаты были жестоко избиты дубинками и ногами, а потом выброшены из здания парламента. По этому факту было возбуждено уголовное дело, где Бородич проходил в качестве одного из подозреваемых. Однако расследование, в ходе которого был засвидетельствован факт грубых действий президентских охранников в отношении обладающих иммунитетом депутатов, было приостановлено. Точка в этом деле не поставлена до сих пор. Ну как об этом не спросить экс-начальника Службы безопасности президента?

Однако, услышав это, советник Бородича сказал: *"Извините, но тогда интервью не будет".*

То, что Юрий Бородич не желает говорить о скандальном избиении депутатов, еще как-то объяснить можно. Не ясно, почему советник Бородича обращает внимание на то, что во время разговора с его шефом не стоит касаться темы Избирательного законодательства. Может, у генерала по этому поводу есть свое мнение, которое могут неправильно понять наверху?..

Марина КОКТЫШ.

ДОСЬЕ

Юрий Бородич родился 10 апреля 1957 года в Гомеле.

В 1979 году окончил Белорусский институт инженеров железнодорожного транспорта, в 1989 году — Высшую школу КГБ СССР им. Ф.Э.Дзержинского, в 2004 году — Российскую академию государственной службы при Президенте Российской Федерации.

С 1982 года по настоящее время — кадровый сотрудник органов государственной безопасности. Занимал различные должности — от оперуполномоченного УКГБ по Могилевской области до заместителя начальника 11 группы "А" Управления охраны при аппарате Президента СССР.

С 1992-го по 1995 г. — начальник группы "Альфа" КГБ Республики Беларусь.

С 1995-го по 1998 г. — начальник Службы безопасности Президента Республики Беларусь.

С декабря 1998 года по июнь 2004 года — официальный представитель КГБ Республики Беларусь при ФСБ Российской Федерации и Антитеррористическом центре СНГ.

С 1997-го по 2001 г. возглавлял Федерацию хоккея с шайбой Республики Беларусь.

7 июня 2004 г. по предложению госсекретаря Совета безопасности Республики Беларусь, согласованному с А.Лукашенко, Бородич избран председателем центрального совета БФСО "Динамо".

26.07.2005 г. назначен председателем постоянной комиссии НОК Беларуси по работе с федерациями по видам спорта, член Исполкома НОК Беларуси.

Пратараніў... цэх

У Рэчыцы аўтамабіль "Мерседэс", якім кіраваў 20-гадовы вадзіцель, пратараніў жалезабетонную агароджу, праламаў яе і заехаў у цэхі завода "Тэрмапласт".

Вадзіцель з пераломам асновы чэрапа дастаўлены ў мясцовую бальніцу.

Фаіна МЯРКУЛАВА.

«Вегетарыянская ежа» для аўто

На беларускім рынку з'явяцца новыя віды аўтамабільнага паліва — біядызель і біяэтанол, магчыма, біяметанол.

Пра гэта паведаміў на пленарным пасяджэнні Беларускага прамысловага форуму, які праходзіў у Мінску, намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Ігар Войтаў. Біяпаліва зараз вельмі моднае ў свеце. Яно альбо цалкам вырабляецца на раслінай аснове, альбо звычайнае паліва разбаўляюць спецыяльнымі раслінными дабаўкамі. Мінск пайшоў на эксперымент, аднак не з-за моды, а з-за неабходнасці эканоміць нафту.

Ігар МАРОЗАЎ.

Дзе ты, «бядачка» Фан Тхі?

Сваё нядоўгае, але плённае знаходжанне ў Віцебску в'етнамка Фан Тхі пачала з таго, што, паводле загадзя распрацаванага плана, заключыла фіктыўны шлюб з мясцовым аматарам экзатычнай прыгажосці, атрымаўшы прапіску і прытулак. Затым госця з Паўднёвага Усходу выпісала з В'етнама сапраўднага мужа і разам з ім разгарнула на тутэйшым рынку вірлівую гандлёвую дзейнасць.

Беларусы расчуліліся і сталі пазычаць "няшчаснай" Фан Тхі грошы. Агулам замежніца выпрасіла ў 18 віцебскіх знаёмцаў больш за 90 тысяч долараў, каля 7 мільёнаў беларускіх рублёў і з'ехала на радзіму.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ГАРАЧАЯ ТЭМА

Адразу ў двух чытаннях

На жаль, пакуль мы не можам расказаць, як праходзіла ў парламенце абмеркаванне адмены сацыяльных ільгот. Бо слуханні былі прызначаны на сераду, а наша газета ў гэты дзень ужо друкавалася. Але амаль за дзень да часу "ікс" стала вядома, што слуханне законапраекта будзе праходзіць адразу ў двух чытаннях. Каб не было куды адступаць...

Старшыня камісіі па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў Сяргей Камянецкі перад пачаткам слуханняў законапраекта прадэманстраваў, каго зараз будзе "абараняць" і парламент, і дзяржава. Ён сцвярджаў: *"Ільготы не адбіраюцца, а ўпарадкуюцца. Частка льгот застаецца, а астатняя — пераразмяркоўваецца. Дзяржаўная дапамога будзе не ўсім, а толькі тым, каму яна сапраўды патрабуецца".* Па словах Камянецкага, ільготы ў поўным аб'ёме застаюцца ўсім інвалідам, удзельнікам вайны, Героям Савецкага Саюза. *"Але льготы менавіта ім, а не іхнім сем'ям"*, — удакладніў дэпутат.

Што тычыцца ліквідатараў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, то Камянецкі фактычна абразіў многіх з іх. *"Ліквідатары, якія сталі інвалідамі, ніякіх ільгот не будуць пазбаўлены. А ўсе астатнія — гэта не ліквідатары, гэта так... На два дні з'ездзілі ў камандзіроўку, і то яшчэ ёсць пытанне, ці ездзілі"*, — цытуе Камянецкага БелаПАН. Цікава, што Сяргей Уладзіміравіч — дэпутат ад Гродзеншчыны, палкоўнік, удзельнік вайны ў Афганістане. Адпаведна, як *"афганец"* ён таксама мае льготы і, трэба разумець, карыстаецца імі. Больш за тое, як удзельнік вайны, хутчэй за ўсё будзе мець ільготы і надалей. Але якая кароткая ў чалавека памяць! Некалі чыноўнікі, як і зараз, хацелі адабраць ільготы, у тым ліку і ў *"афганцаў"*: маўляў, не ўсе афіцэры былі там падоўгу, і наогул не мы іх туды пасылалі... *"Афганцы"* справядліва абураліся. Але зараз Камянецкі амаль тымі ж словамі папракае ліквідатараў...

Дарэчы, плануецца, што закон аб адмене шэрагу льгот павінен уступіць у сілу праз паўгода пасля афіцыйнага друкавання. Іншымі словамі, пакуль прадугледжваецца, што да новага года льготы захаваюцца.

Алег СНОЎ.

ДЫСКУСІЯ

Лідэраў не прызначаюць, імі становяцца

Уважліва прачытаў усе матэрыялы, якія друкаваліся ў "Народнай волі" напярэдадні Кангрэса дэмакратычных сіл. Карыстаючыся правам уключыцца ў дыскусію, якое дае газета, хачу выказаць сваё меркаванне. Штуршком да гэтага з'явіўся артыкул С.Панамарова "Заказ" на Мілінкевіча", які надрукаваны 11 мая 2007 года.

Лічу, што ніякага "заказу" на Мілінкевіча няма. А тое, што адбываецца ў колах апазіцыі, з'яўляецца звычайнай логікай падзей. Так і павінна было здарыцца. Мілінкевіч у свой час быў абраны (дарэчы, з невялікай перавагай галасоў) адзіным кандыдатам ад дэмакратычных колаў на пасаду прэзідэнта. Але прэзідэнтам не стаў, пацярпеў паразу. Адной з прычын гэтага, на маю думку, з'явілася тое, што ён быў не зусім "адзіны". Так бы мовіць, юрыдычна "адзіны", а фактычна яго падтрымалі не ўсе, а калі і падтрымалі, то вельмі вяла.

Што пасля выбараў, па логіцы, павінен быў зрабіць Мілінкевіч? Аб'ектыўна ацаніць сваё становішча, прызнаць паразу і саступіць месца другім, як зрабіў гэта ў свой час У.Ганчарык, які таксама быў абраны "адзіным". А калі і не саступіць, то зноў стаць роўным сярод роўных. Замест гэтага ён сваю паразу ператварае ў "пэўны поспех" і імкнецца ператварыцца з адзінага кандыдата дэмакратычных сіл у адзінага лідэра дэмакратычных сіл.

Такія паводзіны не маглі не выклікаць маўклівага непрыняцця з боку другіх лідэраў дэмакратычных партый і рухаў, а можа, і таго больш — пэўнага супраціву. І ў гэтым іх лёгка зразумець. Большасць з іх на палітычным полі дзейнічаюць даўно, аддалі нямала сіл ў барацьбе за дэмакратыю, цярпелі рэпрэсіі з боку ўлад, але рук не апускалі і сталі добра вядомы не толькі ў сваёй краіне, але і ў дэмакратычным свеце.

А Мілінкевіч, як піша ў сваім лісце С.Панамароў, *"внезапно вышел на политическую арену"*, як колісь "выскочил из табакерки" адзін вядомы палітычны дзеяч, які адштурхнуў былых паплечнікаў і цяпер ні за што не хоча аддаваць уладу. Чым тады ў гэтым сэнсе адрозніваецца ад яго Мілінкевіч, які таксама не хоча аддаваць уладу, хоць і невялікую? Можа, і ён хоча застацца "пажыццёвым"? Ды які ж тады дэмакрат, калі не хоча выконваць дэмакратычны прынцып перыядычнай зменнасці ўлады.

Лічу, што цяперашняе становішча ў колах дэмакратычных сіл (у ходзе падрыхтоўкі да маючага адбыцца Кангрэса) у многім залежыць ад Мілінкевіча, ад яго паводзін і паводзін яго прыхільнікаў. Таму, на маю думку, Кангрэс дэмакратычных сіл павінен выбраць не аднаго старшыню Палітсавета, а некалькіх сустаршыняў, так бы мовіць, калектыўны орган кіравання. Іншымі словамі, кіруючую каманду. А там, дзе каманда, там заўсёды знойдзецца і лідэр. Ён праявіцца сам, праявіцца сваімі здольнасцямі, якасцямі, сваёй мудрасцю і арганізацыйным талентам.

А каб паміж сябрамі каманды, паміж сустаршынямі (а гэта хутчэй за ўсё будуць лідэры палітычных партый і рухаў) была згода, каб яны не ладзілі адзін супраць аднаго інтрыгі, не імкнуліся падставіць адзін аднаму "падножку", трэба яшчэ да пачатку Кангрэса распрацаваць у рабочым парадку, а на самім Кангрэсе зацвердзіць своеасаблівыя "правілы гульні", якіх кожны з ігракоў павінен строга прытрымлівацца. Гэтыя правілы павінны быць адкрытымі, каб іх ведаў кожны шэраговы сябра палітычнай партыі. Тады добра будзе бачна кожнаму, хто з ігракоў іх парушае, а хто гуляе чэсна.

Зазіраючы ў будучыню, трэба мець на ўвазе, што хтосьці з сяброў каманды, які вызначыцца як лідэр, захоча балатавацца на пасаду прэзідэнта краіны. Таму разам з распрацоўкай "правіл гульні" неабходна вызначыць і крытэрыі, якімі можна было б кіравацца пры выбары адзінага кандыдата ад дэмакратычных сіл на пасаду прэзідэнта краіны. У любым выпадку будучы лідэр нацыі павінен быць добрым прафесіяналам у нейкай галіне, бездакорна валодаць беларускай мовай і прыязна ставіцца да праблем нацыянальнага адраджэння. Вядома ж, ён павінен прайсці тэсціраванне на стан фізічнага і псіхічнага здароўя. Грамадскасць мае права пацікавіцца яго сямейным становішчам і адносінамі да сям'і.

Акрамя гэтых крытэрыяў, можна вызначыць і шэраг іншых. Дарэчы, у будучым яны могуць быць уключаны ў Закон "Аб прэзідэнце Рэспублікі Беларусь" ці нават у Канстытуцыю. Калі б гэта было здзейснена, то яны ўвайшлі б у свядомасць грамадства, імі кіраваліся б палітычныя дзеячы, і тады ніхто ў свеце не змог бы папракнуць беларусаў, што яны абралі сабе "случайного президента".

Упэўнены, што ў будучым так яно і будзе. І што Беларусь на роўных увойдзе ў шэраг дэмакратычных, цывілізаваных і заможных краін. А будучыню трэба рыхтаваць ужо сёння.

Ульян САМУСЕНКА,
жыхар Мінска.

Цыплячий бум

В очередь за бройлерами Медновской птицефабрики оказалось 494 человека

"Когда утром шли на работу, то, увидев на дороге к фабрике столько людей, подумали, что настал конец света!" — откровенно призналась работница Медновской птицефабрики.

Такой сумасшедшей очереди, что выросла здесь 18 мая, в деревне не припомнят с того времени, как украинские купцы брали тут "помногу утят".

Это тем более удивительно, что, по воспоминаниям старожилов, в прошлые годы работники птицефабрики не знали, куда девать двух-трехнедельных цыплят по 1,2 тысячи рублей: возили продавать их в Пружаны, Иваново, Дрогичин... Тогда никаких норм отпуска не вводили: хватало и перекупщикам, и рядовым покупателям. А тут такое столпотворение за цыплятами-однодневками по 1,5 тысячи рублей, как будто давали бесплатно!

Действительно, в тот день дорога на птицефабрику в деревне Медно Брестского района больше напоминала пробку у КПП "Варшавский мост" в период приграничного бума. Длинная вереница легковых автомобилей вдоль дороги, на ее обочине и толпы ожидающих людей с картонными коробками в руках. Местные жители — в меньшинстве. В основном очередь состояла из птицеводов, приехавших из Бреста, из-под Малориты, Высокого, Чернавчиц...

В списке, который, сидя в автобусе, тщательно вел один из покупателей, оказалось 494 человека. Кое-кто занимал очередь по второму кругу, выполняя заявки многочисленной родни.

Разговорившись, узнали, что некоторые заняли очередь накануне, еще с вечера, и ночевали в машинах, чтобы успеть закупить бройлерных цыплят-однодневок.

Некоторые "купцы", записавшиеся в очередь, желали приобрести в одни руки по две тысячи цыплят, некоторые — по 700—800 штук. Говорили, что они из числа перекупщиков, которые, приобретя цыплят по 1,5 тысячи рублей, позже собирались "толкнуть" их на рынке по 2—2,5 тысячи "рэ". Цыплячий бизнес доходен! На одной партии цыплят (1000 штук) можно наварить как минимум полмиллиона рублей! "Если предприниматели хотят купить больше, то пусть заключат договоры с птицефабрикой и не мешают населению", — резонно заметил кто-то из толпы.

Правда, как рассказала одна птичница, были и звонки-жалобы: *"Что вы занимаетесь махинациями? Мы покупали бройлерных цыплят, а выросли простые петушки!"* Оказалось, наиболее предприимчивые дельцы зарабатывают сверхприбыль: подмешивают к медновским обычных цыплят, которых можно закупить в Кобрине по дешевке (всего за 150 рублей): даже сельскому покупателю сложно отличить в желтеньком комочке бройлерного однодневку от обычного.

Как бы там ни было, но на этот раз в словесной перепалке с перекупщиками победило большинство желающих закупить крошек для личных подворий. Они помнят, как в минувшие годы в очереди доходило до мордобоя. Сейчас, слава Богу, обошлось без эксцессов: и очередь, и администрация птицефабрики определили норму продажи — в одни руки не более полусотни цыплят. "И то хлеб, — заметил знаток. — Вон на "Дружбе" под Барановичами, где родня живет, давали только по 20".

Может, потому перекупщики и рванули сюда в надежде срубить деньжат по-легкому? Другие связывают небывалый ажиотажный спрос с ограничениями на ввоз мяса из Польши и птичьим гриппом. А в Медно выращивают экологически чистых бройлеров, притом высокопродуктивной голландской породы.

На полянке у жилых домов люди ожидали третий грузовик с очередной партией желтеньких комочков. За два часа до этого продали уже десять тысяч. Обещали подвести еще пять. Стало ясно, что цыплят на всех не хватит.

В положении "сапожник без сапог" оказались... 300 работников птицефабрики, которые выращивают этих самых цыплят. Им уже второй год категорически запрещено покупать и разводить молодняк на подворьях. Они могут закупить своих питомцев только для родственников. Но как? Птичница, отдавшая предприятию полжизни, сетовала: "Просила закупить для родни 30 цыплят — не дают: мол, занимай живую очередь на общих основаниях! А как это сделать, если работаешь?" Мало того, в 5-километровой санитарной зоне вокруг птицефабрики местному населению разрешают держать птицу только в сараях или вольерах с сеткой сверху, чтобы, значит, не было свободного выгула и чтобы не дать заразе проникнуть извне. Таковы меры Минсельхозпрода по борьбе с птичьим гриппом, которые действуют с прошлого года.

Ситуацию объяснила и.о. главного зоотехника Медновской птицефабрики Светлана Шкляник:

— Порода кур у нас хорошая. Уже четвертый год культивируем породу "Голландский кросс-308", которая обладает высокими мясными качествами. Птицу выращиваем и откармливаем в среднем 45 дней. За это время она набирает вес до двух килограммов. Раньше выращивали "Белорусский кросс", привесы которого ниже голландского.

Такого спроса на цыплят птицефабрики никогда не было. В прошлом году даже передерживали цыплят на откорме, пока люди не купят. Тогда продали за сезон (май-июнь) 200 тысяч цыплят. В этом году будет продано больше, так как сезон начался в апреле. На середину мая продали 102 тысячи цыплят — больше прошлогоднего показателя.

Во время первых продаж, когда ажиотажа не наблюдалось, в одни руки отпускали столько, сколько покупатель желал. А с начала мая администрация фабрики вынуждена ввести норму отпуска — не более 50 цыплят в одни руки.

В следующие разы — в конце мая, начале июня, когда планируется реализовать по 27 тысяч штук, вероятно, найдутся счастливчики, которым повезет закупить в одни руки и по тысяче цыплят: все зависит от спроса. Держись, Медно!

Александр КОВАЛЬЧУК.
Фото photo.bymedia.net

Брестский район.

Народная Воля http://www.nv-online.info
25 МАЯ 2007 г.

ЭШЕЛОНЫ ВЛАСТИ

У 39-летнего Игоря Рачковского — пятеро детей

Самому старшему из них — 17 лет, младшему — всего год.

Накануне Дня пограничников недавно назначенный председатель Государственного комитета погранвойск полковник Игорь Рачковский ответил на несколько вопросов "Народной воли".

— Игорь Анатольевич, не секрет, что Ваше назначение для многих было неожиданным. Наверное, поэтому вокруг него ходило много слухов. Будьте любезны, подтвердите или опровергните некоторые из них. Одни говорят о том, что Вы — большой друг Виктора Лукашенко и именно ему обязаны назначением на должность командующего погранвойсками. Другие считают Вас зятем одного из заместителей госсекретаря Совета безопасности Виктора Шеймана...

— Вы прекрасно знаете, что дети президента — Виктор Александрович и Дмитрий Александрович — были в армии. Они проходили службу не на каких-то штабных должностях, а служили в Отдельной службе активных мероприятий.

Были слухи, что якобы Служба безопасности президента их никуда не отпускала, что они были постоянно под контролем. Я могу сказать, что они точно так же, как и все молодые офицеры, которые начинают службу и приходят к нам после окончания гражданских вузов (если там есть военная кафедра), выезжали и неделями находились и в радиоактивной зоне, где проводили мероприятия по защите, и на украинском, пинском, прибалтийском участках, где работали в составе групп повышенной боевой готовности — это группы спецназначения, они наиболее подготовлены технически и работают по ликвидации организованых преступных групп... Если сыновья главы государства проходили службу в ОСАМе — зачем мне скрывать или говорить, что я их не знаю? Конечно, я их знаю. Тем более что в то время ряд мероприятий проводился под моим руководством. Естественно, мы поддерживаем отношения. Но говорить о невероятной близости к президентской семье здесь не приходится. Мы общаемся в основном в рабочих рамках — старший сын Александра Лукашенко Виктор работает в Совете безопасности. В рамках развития спорта — если вы знаете, есть хоккейная команда пограничных войск "Рубеж", в этом году она заняла первое место в Ночной хоккейной Лиге, — мы общаемся с Дмитрием Александровичем Лукашенко. Наше общение ограничивается этими вопросами.

Что касается моего тестя, то он никакого отношения к силовым структурам не имеет. Мой тесть — экономист, доктор наук, преподает в Академии управления при президенте.

— У Вас полковничьи погоны, а все Ваши заместители — генералы. Вас это не смущает?

— Не смущает.

— Кто теперь возглавляет ОСАМ?

— Подполковник Алексей Юрьевич Кадацкий. Он был заместителем начальника отряда по оперативной деятельности, пришел с границы.

— Знаю, что у Вас пятеро детей...

— Да, все дети — мои, я женат одним браком. Старшему ребенку — 17 лет, младшему — год.

— Ваша жена — домохозяйка?

— Сейчас она находится в отпуске по уходу за ребенком. А до этого работала преподавателем в Белорусском государственном экономическом университете на кафедре "Финансы и кредит".

КСТАТИ

Игорь Рачковский намерен преобразовать пограничные войска в пограничное ведомство.

"Нигде в сопредельных государствах пограничных войск нет — есть пограничная служба, — объясняет Игорь Анатольевич. — Войсковой компонент остался только в Беларуси. Но мы же живем не во времена холодной войны. Беларусь не собирается ни с кем воевать. Пограничным ведомствам все больше и больше переходят функции правоохранительных органов..."

Через пару недель на всех пунктах пропуска появятся табло с номерами телефонов Службы собственной безопасности погранвойск, которая теперь, судя по всему, будет работать круглосуточно.

"Проблема коррупции для погранвойск стоит так же остро, как и для таможенных органов, — говорит Рачковский. — Жизнь показала, что надо реформировать и погранвойска, и управленческую деятельность, и органы, которые отвечают за борьбу с коррупцией в погранвойсках. Поэтому на недавней коллегии Госкомитета погранвойск было принято решение об изменении штата Службы собственной безопасности, ее технической оснащенности. Мы будем проводить внезапные рейды — выезжать на пункты пропуска, посты, в комендатуры. Для того, чтобы люди на местах понимали, что существует контроль и чтобы мы были уверены в том, что на границе работают честные и порядочные офицеры".

И самое главное. К концу 2007 года для выезда из страны гражданам Беларуси не понадобится разрешительная запись в паспорте и им не будут ставить отметки в паспорте о пересечении границы. Отказ от штампов в паспортах белорусских граждан станет возможным благодаря полной автоматизации пунктов пропуска через границу. К тому же планируется, что в конце года таможенный и пограничный контроль будет совмещен.

Марина КОКТЫШ.

ИЗ ЛИЧНОГО ДЕЛА

Игорь Рачковский родился в 1968 году в г.Сморгонь Гродненской области. В 1990 году окончил командно-инженерный факультет Рижского высшего военно-политического училища, в 1996 году — курсы Института национальной безопасности Республики Беларусь, в 2001 году — Белорусский государственный экономический университет по специальности "Правоведение". Проходил службу на различных офицерских должностях в Вооруженных силах и органах государственной безопасности. В пограничных войсках с сентября 1998 года. С 2004 года возглавлял Отдельную службу активных мероприятий пограничных войск (ОСАМ), задачей которой является борьба с организованными формами контрабандной и противоправной деятельности, незаконной миграцией, торговлей людьми, транзитным терроризмом на государственной границе и преступностью в пограничном ведомстве. За успехи в работе награжден орденом "За службу Родине" III степени, медалями "За безупречную службу" II и III степени. Указом А.Лукашенко от 10 апреля 2007 года №175 назначен на должность председателя Государственного комитета пограничных войск Республики Беларусь.

ПАЛІТКУХНЯ

«Рух «За свабоду!» ў несвабоднай краіне

Падчас устаноўчага сходу грамадскага аб'яднання "Рух "За свабоду!" ў Гродне старшынёй абраны Аляксандр Мілінкевіч. Сам сход праходзіў амаль у баявых умовах.

Праз гадзіну пасля пачатку сходу ў памяшканне ўварваліся міліцыянеры, якія загадалі ўсім прысутным пакінуць памяшканне, паколькі, паводле іх слоў, будынак замініраваны. Грамадскім актывістам прыйшлося "эвакуіравацца". Пры выхадзе з памяшкання гасцей і дэлегатаў устаноўчага сходу "Руху "За Свабоду!" супрацоўнікі праваахоўных органаў здымалі на відэакамеру.

Ужо ў двары "замініраванага" будынку Аляксандр Мілінкевіч, якога дэлегаты ўсё ж паспелі абраць лідэрам, заявіў:

— Рух створаны дзеля аб'яднання людзей, якія хочуць дзейнічаць, а не сядзець за "круглымі сталамі", дыскуціраваць і займацца дыялогамі. Галоўная нашая мэта — гэта пабудова грамадзянскай супольнасці і прававой дзяржавы, правядзенне вольных і дэмакратычных выбараў у Беларусі. Дзеля гэтага мы яднаем актывістаў, партыйных, беспартыйных людзей, усіх жадаючых працаваць. Будзем працаваць разам.

Працягнуць працу дэлегатам сходу, аднак, не атрымалася. Як паведамілі супрацоўнікі праваахоўных органаў, пошук выбуховых рэчаў можа працягнуцца да двух дзён. Дарэчы, у суседніх пакоях будынку знаходзіцца Генеральнае консульства Рэспублікі Польшча, увесь персанал якога быў таксама эвакуіраваны.

Алег СНОЎ.

КАМПАНІЯ

Паляванне на «талеркі»

Дэманціраваць спадарожнікавыя тэлевізійныя антэны, усталяваныя на фасадах жылых дамоў, патрабуюць ад жыхароў Мінска ўлады горада. Прэс-служба БАЖ паведамляе, што адказныя за вырашэнне гэтага пытання чыноўнікі тлумачаць журналістам, што справа толькі ў эстэтычным выглядзе гарадскіх вуліц, і спасылаюцца на тое, што антэны ўсталяваны без узгаднення з архітэктарамі гарадской адміністрацыі.

На праспекце Незалежнасці — галоўнай вуліцы беларускай сталіцы — месцамі "талеркі" ўжо паздымалі.

Нагадаем, у сярэдзіне красавіка пад пагрозай пакарання штрафам прыбраць спадарожнікавыя тэлеантэны загадалі жыхарам горада Ліды Гродзенскай вобласці. На сёння гэтае патрабаванне распаўсюдзілася на ўладальнікаў гэтых тэлеантэн па ўсёй Гродзенскай вобласці.

"Відаць, улады занепакоены тым, што ў хуткім часе пачне вяшчаць незалежнае тэлебачанне на Беларусь праз спадарожнік з тэрыторыі Польшчы. Таму ўжо зараз дадзены загады правесці так званую інвентарызацыю прыватных тэлеантэн, каб скараціць колькасць спажыўцоў незалежнай інфармацыі. На прыкладзе горада Ліды мы, падаецца, назіралі пачатак агульнадзяржаўнай кампаніі па "выкарчоўванні" яшчэ адной крыніцы незалежнай інфармацыі — спадарожнікавага тэлебачання", — пракаменціраваў барацьбу гарадскіх улад з "талеркамі" кіраўнік Цэнтра прававой абароны СМІ пры БАЖ, былы суддзя Канстытуцыйнага суда Беларусі, доктар юрыдычных навук Міхаіл Пастухоў.

Зараз можна чакаць, што кампанія атрымае рэспубліканскі маштаб, і ў іншых рэгіёнах Беларусі пачнуцца такія ж дзеянні, накіраваныя на скарачэнне карыстальнікаў спадарожнікавымі антэнамі, папярэджвае юрыст.

На яго думку, да вырашэння праблемы ўлады падыдуць выбарча. Будзе праводзіцца селекцыйны аналіз карыстальнікаў спадарожнікавымі антэнамі праз адпаведную рэгістрацыю. Такім чынам з'яўляецца магчымасць стварэць перашкоды ў выкарыстанні гэтых антэн прадстаўнікам апазіцыі ці грамадскім актывістам. А грамадзянам, якія не выклікаюць ва ўлады асцярогі, што будуць распаўсюджваць незалежную інфармацыю, дазволяць усталяваць "талеркі".

Не здзіўляе таксама юрыста, што ўлады знайшлі легальнае абгрунтаванне для сваіх дзеянняў. Маецца на ўвазе артыкул 21.13 новага Кодэкса аб адміністрацыйных парушэннях, які вызначае адказнасць за парушэнне фасадаў пабудоў. Паводле гэтага артыкула, усталяванне тэлеантэн прыраўнялі да афармлення фасаду гэтых будынкаў.

"Такая адвольная трактоўка закона з'яўляецца вельмі спрэчнай і прыцягнутай за вушы", — кажа М.Пастухоў. Ён лічыць, што гэтыя дзеянні ўлад супярэчаць арт.34 Канстытуцыі, які дае права грамадзянам на атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне любой інфармацыі.

"Кідаецца ў вочы, што да гэтай пары ўлада чамусьці не заўважала, што антэны псуюць эстэтычны выгляд будынкаў. У такім выпадку трэба патрабаваць ад грамадзян наводзіць парадак у цэлым на балконах. Прымусіць іх зняць вяроўкі для бялізны ды і бялізну, прыбраць з балконаў старыя шафы, лыжы, рабіць заўвагі, калі дрэнна зашклілі ці пафарбавалі балкон. Але тут можна дайсці да поўнага абсурду, — разважае правазнаўца. — *Зразумела, гэта нагода прычапіцца да спадарожнікавых антэн, менавіта ў іх уся праблема".*

Між іншым юрысты БАЖ адзначаюць яшчэ такі юрыдычны нюанс — у адпаведнасці з новым Адміністрацыйным кодэксам, яго нормы могуць дзейнічаць толькі на будучы час і не распаўсюджвацца на падзеі, які адбыліся да ўступлення кодэкса ў сілу, гэта значыць да 1 сакавіка 2007 года. І калі ў артыкуле 21.13 КоАП размова ідзе пра адказнасць за парушэнне архітэктурнага рашэння фасадаў будынкаў, у тым ліку за ўсталяванне спадарожнікавых антэн, то нормы заканадаўства могуць распаўсюджвацца толькі на тых, хто збіраецца іх усталяваць, але не на тых, хто паспеў зрабіць гэта раней.

— Закон не мае адваротнай сілы, калі пагаршае прававы стан суб'ектаў. У дадзеным выпадку ўльтыматыўнае патрабаванне ўлад зняць антэны, відавочна, пагаршае інтарэсы грамадзян і дзейнічае насуперак іх інтарэсам. Таму з пункту гледжання заканадаўства можна сцвярджаць, што патрабаванне да грамадзян зняць ужо ўсталяваныя антэны неправамернае, і такія дзеянні можна абскарджваць у судовым парадку, — адзначыў Міхаіл Пастухоў.

Але ён тут жа выказаў сумнеў, што суды стануць абараняць інтарэсы грамадзян.

Ігар МАРОЗАЎ.

ПРОИСШЕСТВИЕ

Дерзкое ограбление на Витебщине

Около 12 часов дня главный бухгалтер и кассир (обе — женщины) Дретуньского лесхоза получили в Полоцке в "Белинвестбанке" 126 миллионов рублей для выплаты зарплаты работникам своей организации. Домой они возвращались на "уазике", принадлежащем лесхозу, вместе с шофером. За восемь километров до Дретуни они увидели, что дорога перегорожена бревном.

Когда машина остановилась, из придорожных кустов выскочили двое неизвестных в черной одежде и в масках. У одного из них был обрез охотничьего ружья, у второго — газовый баллончик и шило. Один из грабителей брызнул из баллончика в глаза кассиру и бухгалтеру, после этого преступники схватили один из мешков с деньгами, пробили колеса в машине и умчались в сторону Полоцка на автомобиле Ваз-2106. Добычей грабителей стало 25 миллионов рублей. Остальных мешков с зарплатой они, похоже, просто не заметили.

Как сообщает местная газета "Химик", вскоре всего в километре от места происшествия сотрудники милиции обнаружили сожженные "Жигули", на которых скрылись преступники. Больше о них пока ничего не известно. Милиция ведет активный поиск грабителей, однако на момент подготовки этого номера к печати задержать их не удалось.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Валерий Калинкович не считает, что Козулин должен выйти из тюрьмы

Во вторник стало известно, что Верховный суд Беларуси отказал адвокатам Козулина в удовлетворении надзорных жалоб.

Как известно, 18 апреля защитники экс-кандидата в президенты Дмитрий Горячко и Игорь Рынкевич подали надзорные жалобы в Верховный суд. Они требовали от председателя Верховного суда Валентина Сукало принести протест на предмет отмены приговора суда в отношении Александра Козулина и прекращения производства по делу за отсутствием в действиях Козулина составов инкриминируемых ему преступлений и, следовательно, его освобождения.

Согласно закону, решение по жалобам должно приниматься на протяжении месяца. Это значит, что 18 мая защитники Козулина должны были получить ответ из Верховного суда.

Однако, по словам Игоря Рынкевича, утром 21 мая ему разъяснили, что в Верховном суде *"не успевают рассмотреть дело, а из заместителей председателей никого в суде и вовсе нет"*. Информация о том, что Верховный суд тянет с ответом, тут же разлеталась по средствам массовой информации. Естественно, с комментариями юристов и родственников Александра Козулина. Семья заключенного надеялась, что Александра Владиславовича освободят.

Однако утром 22 мая стало известно, что Верховный суд отказал защитникам Козулина в удовлетворении надзорных жалоб.

— 21 мая мне предложили позвонить в ближайшие дни, — говорит уже бывший адвокат Козулина Игорь Рынкевич. — *Причем уточнили, что такой ответ может быть дан и позже, допускался срок в несколько недель. А утром 22-го в Верховном суде ответили, что дан отрицательный ответ, датированный вчерашним числом, за подписью зампредседателя Валерия Калинковича.*

Сам текст ответа из суда еще не получен, но, думаю, по сути он будет мало отличаться от подобного ответа председателя Мингорсуда, где были просто продублированы доводы решений по делу, вынесенных судами первой и кассационной инстанций. Все судебные ошибки так и остались неисправленными, от надзорных жалоб суд просто отмахнулся. Это означает, что объективное разрешение дела, являющегося политически мотивированным, и освобождение А.Козулина лежит в плоскости изменения политического режима в стране.

Согласно Уголовно-процессуальному кодексу, после отказа в Верховном суде — высшей судебной инстанции у защиты Александра Козулина осталась единственная возможность опротестовать приговор. Они могут направить надзорные жалобы генпрокурору страны Петру Миклашевичу. Он, как и председатель Верховного суда, имеет право принести надзорный протест. *"В свое время Александр Козулин направлял много обращений генпрокурору о нарушении законности в стране*, — говорит Игорь Рынкевич. — *Все они по существу игнорировались. Тогда Александр Козулин, будучи арестованным, написал Петру Миклашевичу, что прекращает с ним переписку. Полагаю, адвокат Дмитрий Горячко, действующий в интересах А.Козулина, определит с ним необходимость и сроки возможной надзорной жалобы на имя генпрокурора".*

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

ПРАТЭСТ

«Зайцы» на праспекце

У нядзелю ў 17.00 на плошчы Бангалор павінна была пачацца акцыя пратэсту моладзі супраць адмены льгот на праезд. І хаця Мінгарвыканкам акцыю не дазволіў, у прызначаны час на пляцоўцы каля ўваходу ў Парк дружбы народаў сабралася каля 200 чалавек. Яны аб'явілі ўладам, што хочуць прыбрацца ў парку.

Аднак месці мятлой — гэтак жа палітычна небяспечна, як і мітынгаваць. Парк быў ачэплены міліцыяй і супрацоўнікамі спецназа, якія наогул нікога не ўпускалі ў парк. Без аніякай прычыны адразу ж былі затрыманыя сем чалавек — сябры маладзёжнай структуры Партыі БНФ Алесь Каліта, Франак Вячорка, Андрусь Ігнатовіч, Андрусь Ігнатчык, Мікалай Якушаў, а таксама сябры незарэгістраванага "Маладога фронту". Хлопцаў адвезлі ў РАУС Савецкага раёна, дзе трымалі на працягу гадзіны.

Каб не тузацца з міліцыяй, 200 удзельнікаў акцыі накіраваліся да сквера імя Янкі Купалы, дзе планавалася зладзіць працяг акцыі з выступамі музыкаў. Але і гэты маршрут міліцыі не спадабаўся: па дарозе да сквера былі затрыманы яшчэ каля дзесятка хлопцаў і дзяўчат. Сам сквер таксама аказаўся ачэплены. Мінакам, якія гэты цёплы дзень вырашылі правесці ў папулярным месцы адпачынку, міліцыянеры тлумачылі, што сквер замініраваны.

У выніку працяг акцыі супраць адмены льгот праз некаторы час адбыўся... на плошчы Незалежнасці, дзе моладзь гуляла ў вясёлыя гульні і спявала песні. Пасля ўдзельнікі акцыі, апранутыя ў кардонныя заячыя вушы (нагадаем, што сімвалам акцыі быў абраны заяц — як сімвал таго, што дзяржава пазбаўляе студэнтаў льгот на праезд), пашыхтаваліся ў калону і пайшлі па праспекце са словамі "Без квітка, бо льготаў няма". Каля Камітэта дзяржаўнай бяспекі калону спынілі і разагналі амапаўцы, якія ўвесь час ехалі па праспекце побач з удзельнікамі акцыі ў аўтазаках.

Кася МАРКОЎСКАЯ.

ДАРЭЧЫ

Ні ў адным горадзе Беларусі ўлады не дазволілі правядзенне акцый пратэсту супраць адмены льгот. Хаця заяўкі грамадскімі актывістамі падаваліся амаль ва ўсіх буйных гарадах.

СТОП-КРАН

Дэпутаты не «пусцілі» прадпрымальнікаў у Канстытуцыйны суд

Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Перспектыва" звярнулася да дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Генадзя Навіцкага з просьбай, каб тыя ініцыявалі зварот у Канстытуцыйны суд аб праверцы канстытуцыйнасці некаторых пунктаў з прэзідэнцкага Указа "Аб некаторых мерах па рэгуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці", а менавіта — нормы ўказа аб абмежаванні найму работнікаў членамі сям'і альбо роднымі індывідуальных прадпрымальнікаў.

Нагадаем, што з 1 студзеня 2008 года ўсе індывідуальныя прадпрымальнікі змогуць прымаць да сябе на працу толькі сваякоў. У сваім звароце "Перспектыва" адзначала, што асобныя нормы ўказа можна лічыць неканстытуцыйнымі, паколькі яны *"парушаюць не толькі права індывідуальнага прадпрымальніка на выбар асоб, якім можна даручыць выкананне той ці іншай работы, але таксама права на працу грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія маюць жаданне заключыць з індывідуальнымі прадпрымальнікамі працоўныя альбо грамадзянска-прававыя дамовы"*.

Цікава, што дэпутатаў з Камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, траспарце, сувязі і прадпрымальніцтве Нацыянальнага сходу Беларусі, якія далі адказ РГА "Перспектыва", рабіць сваё заключэнне наконт прадпрымальніцкага звароту ў суд ніхто не прасіў.

"Наш зварот — гэта рэакцыя на словы старшыні Канстытуцыйнага суда Рыгора Васілевіча, які ў адным з інтэрв'ю сказаў, што, маўляў, няхай прадпрымальнікі звяртаюцца да нас са сваімі спрэчнымі пытаннямі, мы іх разгледзім, — расказаў карэспандэнту "Народнай волі" старшыня РГА "Перспектыва" **Анатоль ШУМЧАНКА**. — *Аднак па законе такі запыт у суд могуць зрабіць толькі Палата прадстаўнікоў, Савет міністраў, Вярхоўны суд альбо прэзідэнт. Вырашылі звярнуцца да народных абраннікаў, якім, спадзяваліся, неабыякавы лёс тысяч людзей, якія могуць застацца без працы. І вось атрымліваем адказ, што ЯНЫ лічаць, што норма не супярэчыць Канстытуцыі і няма сэнсу звяртацца ў Канстытуцыйны суд. Паўтаруся, мы не прасілі іх даваць нейкія свае каментарыі да нашага звароту, мы папрасілі дэпутатаў стаць пасярэднікамі паміж намі і Канстытуцыйным судом, які і павінен быў бы даць канчатковы адказ. А наш зварот нават не перадалі! І тут узнікаюць пытанні: чаму дэпутаты так зрабілі? Можа, ёсць сумненні, што Канстытуцыйны суд можа вырашыць пытанне на нашу карысць?"*

На мінулым тыдні прадпрымальнікі звярнуліся ўжо ў сенат. Цікава, які будзе адказ адтуль?

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
25 МАЯ 2007 г.

ПЫТАННІ, ЯКІЯ НАПРОШВАЮЦЦА

Трапілі пад «газавы прэс»

Падпісаны дагавор аб стварэнні сумеснага газатранспартнага прадпрыемства з расійскім "Газпромом" на базе ААТ "Белтрансгаз". За першыя 12,5 працэнта акцый нашага "Белтрансгазу" расійскі газавы манапаліст заплаціць 625 мільёнаў долараў.

Да 1 сакавіка "Газпром" стане ўладальнікам 50% акцый "Белтрангаза". Такім чынам, гэта стратэгічнае прадпрыемства будзе ўжо не нашым, а сумесным з "Газпромом".

Але ж газ купляць прыйдзецца і потым, і па высокай цане. Так што "Белтрансгаз" у перспектыве можа аказацца поўнасцю расійскім. І не толькі ён. Расійскія алігархі даўно паклалі вока на вядучыя прадпрыемствы Беларусі. І, як паказвае вопыт з "Белтрансгазам", поўны рашучасці дамагацца свайго.

Чым жа тлумачаць беларускія ўлады сваё рашэнне наконт продажу акцый "Белтрансгазу"? Тут паказальна заява першага віцэ-прэм'ера Уладзіміра Сямашкі на прэс-канферэнцыі. Ён падкрэсліў, што выручаныя ад продажу 12,5% акцый "Белтрансгазу", не будуць выкарыстаныя на пагашэнне доўгу перад "Газпромом". "Гэтыя грошы павінны працаваць на развіццё эканомікі". Паводле слоў У.Сямашкі, 625 млн долараў, якія Беларусь атрымае ад продажу першага пакета акцый "Газпрому", пойдуць у бюджэтны Фонд нацыянальнага развіцця на рэалізацыю інвестыцыйных праектаў.

У.Сямашка патлумачыў, што па кантракце з "Газпромом", які быў падпісаны 31 снежня 2006 года, у першым паўгоддзі Беларусь аплачвае 55% ад рэальнага кошту газу. "А далей, па вызначаным алгарытме, мы павінны будзем выйсці на 100% і вярнуць доўг, які ўтварыўся ў першым паўгоддзі", — зазначыў ён. Нагадаем, што на 1 красавіка гэтага года запазычанасць ААТ "Белтрансгаз" перад "Газпромом" за імпартуемы прыродны газ складала 365,3 млн долараў.

Паводле слоў У.Сямашкі, рашэнне аб стварэнні СП з "Газпромом" было прынята правільна, паколькі краіна трапіла пад велізарны прэс. "Пасля павышэння больш чым у два разы кошту за газ многія не верылі, што беларуская эканоміка вытрымае. Аднак мы даказалі сваю ўстойлівасць", — сказаў першы віцэ-прэм'ер.

Тут самі напрошваюцца пытанні.

Калі вытрымалі і "даказалі сваю ўстойлівасць", то навошта прадаём "Белтрансгаз"? Тым больш што аплачваем пакуль толькі "55 працэнтаў рэальнага кошту газу". Што ж будзе, калі пачнём аплачваць поўны кошт газу і з кожным годам усё па большай цане?

Якія прадпрыемствы будзем прадаваць яшчэ?

Адказ на іх, думаецца, у словах таго ж Сямашкі на той жа прэс-канферэнцыі: "Рашэнне аб стварэнні СП з "Газпромом" прынята правільна, паколькі краіна трапіла пад вялізны прэс". А прэс гэты выкліканы двухкратным павышэннем цэн на газ.

Ці апошні гэта расійскі "прэс"?

Алесь ДРАБЧУК.

Цэны зноў «газанулі»

Больш дарагія кошты на газ і нафту ўзвінчваюць цэны ў Беларусі. Шпарка яны растуць на бензін. Вось і днямі ў чарговы раз яны падскочылі ў сярэднім на 5 працэнтаў, у выніку чаго Беларусь упэўнена выходзіць у лідэры сярод суседзяў па кошце на бензін.

Кошты бензіну ў нас і ў суседніх краінах (у бел.рублях)

Краіна	А-76	А-92	А-95	дызпаліва
Расія	1310	1550	1670	1540
Украіна	1510	1640	1750	1410
Літва			2640	2500
Беларусь	1530	1930	2200	1540

Россию и Эстонию пригласили в «клуб богатых». Когда же пригласят Беларусь?

Организация экономического развития и сотрудничества (ОЭСР), объединяющая 30 крупнейших стран с рыночной экономикой, пригласила Россию провести переговоры по вступлению в ОЭСР. Кроме России организация также хочет видеть в своих рядах Эстонию, Чили, Израиль и Словению. Об этом говорится в официальном пресс-релизе ОЭСР.

Еще пять стран были включены в список кандидатов на присоединение к организации. Ими стали Бразилия, Китай, Индия, Индонезия и ЮАР. Одним из важнейших условий для вступления в ОЭСР является приверженность принципам рыночной экономики и демократии. Ряд членов организации выступает против присоединения крупных развивающихся стран, поскольку сейчас в ОЭСР входят в основном государства с развитой экономикой.

В России уже заявили, что приняли приглашение и будут добиваться полноправного членства в организации. "Мы этого приглашения ждали одиннадцать лет", — отметил глава департамента экономического сотрудничества министерства иностранных дел Андрей Кондаков. Его слова передает РИА "Новости".

ОЭСР была основана в 1961 году и является одной из главных межправительственных международных организаций. В нее, в частности, входят США, Великобритания, Франция и другие страны с крупнейшими мировыми экономиками.

ВОПРОС РЕБРОМ

Где искать саботажника?

О том, что белорусской экономике нужны серьезные преобразования, говорят практически все: от президента до самого радикального оппозиционера. Наиболее системно об этих преобразованиях говорят экономисты и бизнесмены, ратующие за то, чтобы в своих действиях власть придерживалась разработанной независимыми экспертами Национальной платформы бизнеса.

Именно о ней шла речь на проведенном Минским столичным союзом предпринимателей и работодателей "круглом столе" "Бизнес Беларуси в контексте новой экономической политики".

Правда, во время форума некоторые его участники отмечали, что разговорами об экономических преобразованиях во многих сферах экономики дело и ограничивается. Первая часть "круглого стола" так и называлась: "НЭП для Беларуси. Декларации и реальность". О том, какова все-таки реальность, корреспондент попросил рассказать модератора форума экономиста **Ярослава РОМАНЧУКА**:

— Реальность такова, что сегодня практически нет никаких доказательств того, что власть действительно настроена на проведение серьезных рыночных реформ и либерализацию экономики. Есть незначительные облегчения в порядке регистрации, в системе штрафов и наказаний. Есть также слова о том, что чиновникам необходимо переосмыслить свой подход к бизнесу. Но это капля в море. Пока чиновники не получат конкретные целеуказания непосредственно от президента, они будут бойкотировать его установки на развитие бизнеса.

Сейчас ситуация напоминает бутерброд. Сверху президент говорит о налоговой реформе, о деловом климате, об инвестициях и даже о приватизации. Снизу мы говорим о том же. Но в середине этого бутерброда находятся чиновники — огромная нереформированная желеобразная масса, которую необходимо активизировать. Пока этой активизации не произойдет, за словами не последует действие.

— И сколько времени будет длиться такое бездействие?

— До конца этого года и какую-то часть 2008-го. Пока состояние финансов страны, банковской системы, кошельков домашних хозяек не начнет очевидно ухудшаться. Уже видно по макроэкономическим показателям, что обеспечивать рост экономики при помощи старых источников нельзя. Даже Лукашенко сказал, а Сидорский повторил этот тезис, что мы полностью выжали все из крупных госпредприятий и что единственный незадействованный источник роста — это предпринимательство.

— Но можно ли перестроить, изменить чиновников?

— Мы не надеемся, что даже при самом демократическом правительстве чиновники вдруг станут ангелами. Чиновники — это те же люди, белорусы, воспитанные в той же среде. Они привыкли жить по бумажке. Только надо, чтобы те бумажки, по которым они живут и работают, были предельно понятными, четкими и не давали им бразды правления над экономикой.

Если такое разграничение произойдет, если мы определим четко полномочия каждого органа власти, то это будет самая хорошая основа для создания устойчивой независимой страны. Потому что Лукашенко говорит о независимости, и я в этом плане его полностью поддерживаю, но действительную независимость может обеспечить только та модель, в которой олигархи любой другой страны не в состоянии были бы купить наших чиновников. А это возможно только в модели свободного рынка, которую мы и предлагаем.

— На каких направлениях, определенных в Национальной платформе бизнеса, на Ваш взгляд, сейчас стоило бы акцентировать внимание?

— Многие тезисы, определенные в платформе, уже нашли свое отражение в различных документах. Уже все понимают, что необходимо вводить заявительный, а не разрешительный принцип регистрации, что с существующей моделью лицензирования также далеко не уедешь.

По поводу налогов даже министр финансов заявил, что со следующего года бюджет будет верстаться с учетом реального сокращения налоговой нагрузки. Однако к таким заявлениям стоит относиться осторожно. То, что мы видим в первом квартале текущего года, — это резкое увеличение налоговой нагрузки на экономику. Данный пример типичен. Высшая власть говорит одно, а саботаж идет по всей вертикали, которая делает привычное для себя дело социалистической экономики.

Андрей АЛЕКСАНДРОВИЧ.

Энергия шин

Цементные заводы Беларуси внедрят технологию сжигания старых автотранспортных шин для получения энергии для производства цемента.

Одновременно будет решаться экологическая проблема по утилизации отходов, сообщили специалисты Министерства архитектуры и строительства.

В соответствии с программой по энергосбережению Минстройархитектуры, такой проект запланировано реализовать до 2010 года. Кроме того, на цементных заводах планируется заменить использование природного газа на уголь в объеме 1 млн тонн.

Производство стройматериалов — цемента, извести, стекла, керамических изделий — по-прежнему остается самым энергоемким. Исходя из этого, снижение затрат топлива на их производство является самой актуальной задачей для ученых, работающих в строительной сфере.

Устраивает? Кого?

Беларусь согласовала с Китаем реализацию 27 совместных инвестпроектов на общую сумму 2,7 млрд долларов, сообщил на пресс-конференции первый заместитель министра экономики Беларуси Петр Жабко.

По его словам, в перспективе "мы имеем очень серьезные намерения по инвестиционному сотрудничеству с Китаем". Он подчеркнул готовность Беларуси приобретать китайское оборудование, которое ее устраивает, исходя из принципа "цена — качество". П.Жабко также отметил, что белорусскую сторону полностью устраивает стоимость ресурсов, предложенных китайской стороной для реализации этих проектов. В ближайшее время Беларусь начнет закупку оборудования в Китае для реализации проектов в сфере энергетики, промышленности стройматериалов, легкой промышленности, деревообработки.

Здесь напрашивается вопрос: по цене, может, китайское оборудование и устраивает, но устраивает ли оно по технолого-инновационному уровню?

Самолеты для VIP-персон

На Минском авиаремонтном заводе из российских военных самолетов делают элитные лайнеры для VIP-персон.

Вместо красных звезд на крыльях — сочные цвета и играющий на солнце лак. Вместо аскетичного армейского салона — бледно-желтая кожа кресел, красное дерево меблировки, DVD и прочие роскошные излишества.

Минск первым среди столиц СНГ начал переделывать советские самолеты в воздушные суда повышенной комфортности. С конвейера уже сошли 2 машины.

СЛЁЗЫ ПЕНСІЯНЕРАЎ

Скажыце, дзе можна паабедаць за 800 рублёў?

У пісьмах і размовах пенсіянеры часцей за ўсё задаюць адно і тое ж пытанне: "Як пражыць на такія грошы?" Але чыноўнікі нібы не чуюць іх. У адказ заяўляюць, што ў нас, маўляў, сярэдняя пенсія большая за бюджэт пражытачнага мінімуму. Дык чаго ж вы яшчэ хочаце?

Тут у самы раз пацікавіцца гэтым самым бюджэтам пражытачнага мінімуму. На сайце Міністэрства працы і сацыяльнай абароны сказана, што *"бюджэт пражытачнага мінімуму ўяўляе сабой коштавую велічыню мінімальнага набору матэрыяльных даброт і паслуг, неабходных для забеспячэння жыццядзейнасці чалавека і зберажэння яго здароўя"*, а таксама для аплаты абавязковых плацяжоў і ўзносаў.

Пастановай Савета міністраў Беларусі ад 2 мая 2007 года №550 устаноўлены памеры бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах у разліку на адзін месяц на перыяд з 1 мая па 31 ліпеня 2007 года. Гэтай пастановай для пенсіянераў вызначана сума 158.640 рублёў. Вызначаны і артыкулы расходаў: на харчаванне — 50,7 працэнта ўказанай сумы, на аплату памяшкання і камунальных паслуг — 17,7 працэнта, на прадметы гардэробу — 15,9 працэнта, на прадметы першай неабходнасці, санітарыі і лекі — 2,1 працэнта і г.д.

Ну што ж, давайце прыкінем, ці сапраўды хапае такіх грошай на "мінімальны набор матэрыяльных даброт і паслуг, неабходных для забеспячэння жыццядзейнасці чалавека і зберажэння яго здароўя"?

Як вышэй сказана, лічыцца, што на прадукты харчавання дастаткова 50,7 працэнта вызначанай сумы. Простыя разлікі паказваюць, што 50,7 працэнта ад бюджэту пражытачнага мінімуму пенсіянера (158.640 рублёў) — гэта 80.410 рублёў. Гэта 2680 рублёў на дзень. А ў дзень трэба есці тры разы. Дзелім суму на тры і атрымліваем 893 рублі — па столькі прыходзіцца на сняданак, абед і вячэру.

Хочацца спытаць у чыноўнікаў, якія вызначалі суму бюджэту пражытачнага мінімуму: дзе знайсці сталоўку, у якой можна паабедаць за 893 рублі? Гэтай сумы ледзь хапае на 2 шклянкі малака і паўбатона. Няхай бы самі паспрабавалі хоць тыдзень пахарчавацца на такія грошы.

Пойдзем далей. На лекі, прадметы першай неабходнасці і санітарыі вызначана 2,1 працэнта ад агульнай сумы — гэта значыць 3330 рублёў. Іх ледзь хопіць на мыла, зубную пасту, пральны парашок, венік... А за што купляць лекі? У пенсіянера ж — дзве-тры, калі не болей, хваробы і эфектыўныя лекі ад кожнай каштуюць ад 10 да 30 тысяч рублёў. Вось вам і "дастатковы набор даброт", неабходных для... "зберажэння здароўя"!

Чыноўнікі таксама лічаць, што 17,7 працэнта ад устаноўленай імі сумы цалкам хопіць на аплату камунальных плацяжоў. 17,7 працэнта ад 158.640 — гэта 28.072 рублі. Зноў вельмі хочацца спытаць у іх: "Дзе ж гэта, у якім месцы такія не высокія плацяжы за камунальныя паслугі? На Месяцы?" У нас жа за аднапакаёўку зімой людзі выкладвалі па 50 тысяч рублёў. А электрычнасць? А тэлефон?

Вось такі сумны малюнак. А ў многіх жа пенсіі меншыя за бюджэт пражытачнага мінімуму. Мінімальная пенсія па ўзросце складае ўсяго 136,9 тысячы рублёў. З яе на сняданак, абед і вячэру можна выдзеліць толькі па 771 рублі, а на прадметы першай неабходнасці і лекі — 2874 рублі.

То навошта складаюцца такія бюджэты пражытачнага мінімуму? Цяжка паверыць, што іх складальнікі не ведаюць, што на такія сумы не пражывеш, хутчэй працягнеш ногі. Напэўна, усё робіцца для прапаганды, каб па дзяржаўных СМІ можна было бубніць: а ў нас, маўляў, пенсіі перавышаюць бюджэт пражытачнага мінімуму.

Алесь ДРАБЧУК.

ФОТААКНО

На склад!

На 1 мая 2007 года запасы гатовай прадукцыі на прамысловых прадпрыемствах Беларусі павялічыліся ў фактычных цэнах з пачатку года на 40,2%. Пра гэта паведамілі ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу.

Найбольшыя суадносіны запасаў гатовай прадукцыі і сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці склаліся ў лёгкай прамысловасці — 140,8% (гэта на 10,1% больш, чым на 1 мая 2006 года), машынабудаванні і металаапрацоўцы — 103,7% (на 7,2% больш) і харчовай прамысловасці — 92,4% (0,6%).

ВОПРОС

Кого тянуть в суд за неуплату коммунальных платежей — пенсионера или того, кто установил ему такую пенсию?

В последнее время раздаются угрозы в адрес неплательщиков коммунальных услуг.

В списке претендентов на выселение из своих квартир 30 минских семей. Власти утверждают, что они устали церемониться с должниками, которые месяцами не платят за квартиру. В минувшем году выселению подверглись 14 семей. За первые месяцы 2007-го — две.

Выселенцев было бы куда больше, если бы руки коммунальников не были связаны законодательством. Как сообщила главный бухгалтер управления жилищного хозяйства Мингорисполкома Татьяна Жебрун, закон позволяет применять эту меру только в отношении государственного жилья, а такого в Минске осталось лишь 20%, остальное (дома жилищно-строительных кооперативов, товарищества собственников, приватизированные квартиры) государству уже не принадлежит.

Но кто же такие неплательщики? Отвечая на вопрос БелаПАН о социальном портрете неплательщика, представитель Мингорисполкома подчеркнула, что доля недисциплинированных потребителей услуг ЖКХ приходится на пенсионеров (4%) и безработных (около 8%). Основные неплательщики — неблагополучные семьи (37%). Помимо того, большие долги нередко накапливают студенты, дети-сироты.

Вот это и наводит на горькие размышления. Ведь пенсионер имеет столько денег, сколько дает ему государство в виде пенсии. И разве он виноват, что этих средств не хватает на еду, лекарства и на оплату коммунальных услуг? А где на оплату услуг коммунальников возьмут деньги безработные, дети-сироты? Как-то не поворачивается язык называть всех их злостными неплательщиками. И какой же выход видят коммунальники?

СМИ сообщают, что на оперативном совещании в Мингорисполкоме начальник главного производственного управления жилищного хозяйства горисполкома Борис Васильев докладывал: с начала года неплательщикам отослано 68 тысяч предупреждений. Для сравнения, за аналогичный период 2006 года этой категории граждан было направлено 50 тысяч предупреждений. Выдано 28 тысяч предписаний на отключение коммунальных услуг, в прошлом году — 20 тысяч. В суд подано 3793 иска (в прошлом году — 2230) на 1 млрд 949 млн рублей.

Вот так, оказывается, воюют с пенсионерами, безработными, детьми-сиротами, неблагополучными семьями.

Конечно, с неплательщиками следует бороться и такими методами, Но с истинными, с теми, кто имеет возможность, но не платит. Таких ведь хватает.

Коммунальников волнуют, видимо, не столько они, сколько то, что "суды не рассматривают дела о выселении и переселении семей, где есть несовершеннолетние дети". "Мы, конечно, ждем изменений в законодательных актах, в первую очередь в Жилищном кодексе", — цитируют газеты некоторых из них.

Срок неуплаты, заканчивающийся выселением, как правило, превышает шесть месяцев, а суммы долга колеблются в диапазоне 2—5 млн рублей. Задолженность по коммунальным платежам имеют более 50 тысяч минчан. Конечно, хотелось бы знать, кто они. Сколько из них пенсионеров, безработных, неблагополучных семей, и какой у них доход? И если у пенсионера не хватает денег на лекарство, то, видимо, еще надо подумать, кого тянуть в суд — его или того, кто установил ему такую пенсию?

Сергей ИВАНОВ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
25 МАЯ 2007 г.

Румыны против отставки президента

Президент Румынии Траян Бэсеску легко одержал победу на референдуме, в ходе которого граждане страны отвечали на вопрос, поддерживают ли импичмент главы государства.

Практически три четверти избирателей, участвовавших в плебисците, высказались в поддержку Бэсеску.

19 апреля этого года на совместном заседании обеих палат румынского парламента президент Румынии Траян Бэсеску был отстранен от должности. Решение было принято по итогам доклада специальной парламентской комиссии. Левая оппозиция обвиняет Бэсеску в "тоталитарных наклонностях", злоупотреблении властью, прослушивании телефонных разговоров членов правительства, коррупции.

Конституционный суд Румынии признал, что нарушения Бэсеску носят "незначительный характер и не могут служить основанием для отстранения от должности". Сам Траян Бэсеску обвинения в свой адрес отвергает.

В истории современной Румынии импичмент президенту еще ни разу не объявлялся. Истоки политического кризиса в Румынии обозреватели видят в личном противостоянии президента с премьер-министром — Кэлином Тэричану.

Оно началось еще в прошлом году, когда главе правительства пришлась не по душе инициатива президента о проведении досрочных парламентских выборов. Затем Тэричану призвал к немедленному выводу румынских войск из Ирака, против чего выступил Бэсеску.

Кризис продолжился распадом коалиции Национал-либеральной партии и пропрезидентской Демократической партии. Премьер Тэричану исключил демократов из состава правительства, после чего парламент сформировал новый Кабинет из либералов и представителей партии Демократический союз венгров Румынии, поддержанный оппозицией.

ЕС—РОССИЯ

«Мясной» саммит

Фактически провалом закончился саммит России и Европейского Союза в Самаре. На нем не было подписано никаких документов.

Но говорят, что встреча на высшем уровне дала старт переговорам по ряду новых соглашений. Владимир Путин назвал предположения о провале саммита "абсолютно ложным посылом". По его словам, стороны договорились по всем вопросам, за исключением "острых и требующих дополнительного изучения".

Еще до начала саммита было ясно, что между Россией и ЕС накопилось немало этих "острых" вопросов.

До

Министр иностранных дел Польши Анна Фотыга заявляла, что одной лишь отмены российского эмбарго для того, чтобы Варшава перестала блокировать начало переговоров между Москвой и Брюсселем, недостаточно. Она считала, что саммит ЕС—Россия не подготовлен как следует — прежде всего потому, что немецкие организаторы встречи в Самаре уделили недостаточно внимания вопросу об энергетической безопасности ЕС — а именно с энергетической безопасностью связано второе требование Польши.

"Во-первых, отмена эмбарго на польские продукты, а во-вторых, и мы давно добиваемся этого — принятие механизма солидарности стран ЕС в том, что касается вопросов энергетической безопасности. Должны быть также гарантии того, что эмбарго на польские продукты будет отменено надолго. Вот и все наши требования", — заявила Анна Фотыга.

Министр подчеркнула, что польское правительство настаивает на принятии Европейским Союзом специальной политической декларации, в которой была бы запись о гарантиях солидарной позиции всех стран — членов ЕС в вопросах, связанных с поставками энергоносителей. "Нельзя начинать переговоры, не принимая во внимание столь важные элементы".

Судебные слушания по уголовному делу в отношении известного исполнителя шансона Виктора Калины и его супруги Светланы начнутся 29 мая в суде Первомайского района. "Король белорусского шансона" Виктор Калина обвиняется в мошенничестве в особо крупном размере (ч.4 ст.16 и ч.4 ст.209 УК), организации заведомо ложного доноса (ч.4 ст.16 и ч.2 ст.400 УК) и заведомо ложного показания (ч.2 ст.401 УК), а его супруга — в совершении мошенничества в особо крупном размере (ч.4 ст.209 УК). В настоящее время Виктор Калина находится в СИЗО, а его супруга в феврале была отпущена из-под стражи под залог.

На память о Янке Купале

В Минске из экспозиции "Петербургский уголок писателя" музея имени Янки Купалы были похищены... ручка и крышка от чернильницы. Об этом сообщила пресс-секретарь Центрального РУВД Минска Светлана Кабкова. По ее словам, на днях в милицию обратилась хранительница фондов музея имени Янки Купалы и рассказала о пропаже. Ручка и крышка от чернильницы были приобретены соответственно за 50 копеек и 5 рублей в Ленинграде в 1974 году для воссоздания экспозиции, то есть личными вещами писателя не были. Но, видимо, похититель об этом не знал.

Народная Воля http://www.nv-online.info
25 МАЯ 2007 г.

ПЕРСОНА

Юлія СКАРАХОД:

«Я дакладна ведаю, што вярнуся...»

Яе зорка запалілася ў сярэдзіне васьмідзесятых гадоў. Тады спявачка Юлія Скараход уваходзіла ў знакаміты не толькі на ўсю Беларусь, але і на ўвесь Савецкі Саюз ансамбль "Верасы". Але ў сярэдзіне 90-х гадоў яна раптоўна знікла з эстраднага небасхілу. Юлія пераехала ў Варшаву. На радзіме яна бывае не вельмі часта. Нядаўна Юля прыязджала ў Мінск да бацькоў. А заадно і расказала "Народной волі" пра сваё жыццё-быццё.

— Юля, раскажыце, чаму Вы з'ехалі з Беларусі?

— У кожнага чалавека ў жыцці бываюць такія моманты, калі трэба прымаць нейкае адказнае рашэнне. Пры ўсёй маёй бязмежнай любові да Беларусі надышоў момант, калі захацелася паспрабаваць нешта новае, нязведанае. Я пераехала ў Варшаву, таму што там жыве і працуе мой муж. Ён, дарэчы, працуе ў тамашнім шоу-бізнесе. А ў Беларусі я бываю зараз не так часта, як хацелася б.

— Некаторыя прычынай Вашага ад'езду называлі банальную страту голасу. Казалі, што пасля таго як Вы трапілі ў аварыю, нейкая варажбітка параіла Вам з'ехаць з Беларусі. У гэтым ёсць доля праўды?

— Страта голасу? Цікава... Мякка кажучы, гэта не адпавядае рэчаіснасці. Я яшчэ раз паўтараю — мой пераезд у Польшчу быў абумоўлены выключна сямейнымі абставінамі.

— А што наконт аварыі і парады варажбіткі?

— Варажбіткі ніякай не было. Аднак у страшнай аварыі я і насамрэч пабывала. Мы разам з артыстам Валерыем Дайнекам ехалі выступаць у Маладзечна. Да горада заставалася кіламетраў 8—10. І раптам шафёр "запіжоніў". Вырашыў паказаць клас на мокрым асфальце. Нас вынесла ў кювет. Машына моцна аб нешта ўдарылася. Калі ачуняла, то ўбачыла, што твар у крыві, моцна балелі рукі і ногі... Ты можаш у гэта не паверыць, але перад самай аварыяй я чамусьці ўзгадала, як разбіўся вядомы аўтагоншчык Аэртан Сена... Літаральна праз дзесяць хвілін у аварыю трапілі і мы... Вось табе і боскае прадбачанне.

— У Польшчы Вы таксама спяваеце?

— Спяваю, але не на тым узроўні, як гэта было ў Беларусі. Тым больш зараз я атрымліваю зусім немузычную прафесію — летам спадзяюся атрымаць дыплом, які дазволіць мне кіраваць прамысловым прадпрыемствам.

— З-за вучобы Вы на музыку зусім забыліся?

— Не. У мяне запісана вельмі шмат песень на англійскай, польскай, беларускай мовах. З імі я і выступаю ў Польшчы. Але гэта — на добраахвотным пачатку.

— Цікава, а з беларускімі артыстамі стасункі падтрымліваеце?

— Дагэтуль цёплыя адносіны ў мяне захаваліся з Аляксандрам Ціхановічам і Ядвігай Паплаўскай, Васілём Раінчыкам. Дарэчы, дзякуючы Раінчыку я і трапіла на эстраду. А дагэтуль я і не ўяўляла сябе спявачкай. Скончыла музычную школу па класе фартэпіяна. Іграла ў музычным калектыве "Мінск", трохі спявала. На адным з выступленняў мяне заўважыў Раінчык. Падышоў і сказаў: "Заўтра "Верасы" ад'язджаюць на канцэрт у Хабараўск. Вам трэба ехаць з намі".

— Вы, канечне, адразу прынялі прапанову?

— Так. А вось мама з татам хваляваліся. Бацькоў можна было зразумець — мне ж было толькі 17 гадоў. А Хабараўск — не блізкі свет. Але, павагаўшыся, бацькі здаліся. Я ім дагэтуль удзячна.

— Юля, а прафесійнай рэўнасці ў Вашай сям'і не было? Маю на ўвазе Вашага брата — спевака і кампазітара Альберта Скарахода, якога Вы, па меркаванні некаторых, пераплюнулі па папулярнасці...

— Хто яшчэ каго раўнаваць павінен (*Смяецца.* — **Аўт.**)! Справа ў тым, што я першай прыйшла ў музыку. Алік для мяне быў і застаецца адным з лепшых спартсменаў. Ён, між іншым, таксама хацеў хадзіць у музычную школу. Але ў той год, калі яго туды адвялі, жадаючых займацца там было значна больш, чым вакансій. Таму тата аддаў яго ў гімнастыку. Ты ж ведаеш — з яго атрымаўся выдатны спартсмен і трэнер. А ў музыку Альберт прыйшоў, калі каратэ, якім ён паспяхова займаўся, апынулася пад забаронай. Неўтаймаваную спартыўную энергію Альберт выплёскваў на сцэне. Ён першым з усіх заспяваў стоячы на галаве. Маю права сказаць, што вядомы расійскі спявак Алег Газманаў быў у гэтым сэнсе другім.

— Юля, а вярнуцца ў Беларусь і нагадаць пра сябе, як пра спявачку не жадаеце?

— Вельмі хачу. У маіх творчых планах — правядзенне вялікага сольнага канцэрта ў Беларусі. Ведаю, што за гады маёй адсутнасці беларускі шоубізнес (у часы майго выступлення ў "Верасах" такога слова ўвогуле ніхто не ведаў) змяніўся, але старыя сувязі засталіся. Не будзем загадваць, але я думаю, што ў хуткім часе я прыеду ў Беларусь з сольнай праграмай.

Я сумую без сваіх беларускіх прыхільнікаў. Хачу адказаць ім словамі з песні Ігара Талькова: *"Я дакладна ведаю, што вярнуся..."*. І гэта адбудзецца вельмі хутка...

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Мокрая гісторыя, альбо Восем тон дажджу на галаву

Днямі гурт "Лекарство от меланхолии" (больш звыклая назва якога "Л.О.М.") прэзентаваў свой новы кліп на песню "Музыка дождей".

Рэжысёрам кліпа выступіла **Аляксандра Бутар.** Яна вядомая па працы з **Іскуі Абалян, Аляксандрам Патлісам** і іншымі вядомымі беларускімі выканаўцамі.

Аляксандра прызналася, што сцэнарый кліпа на песню "Музыка дождей" быў напісаны літаральна за некалькі хвілін.

"Мы сядзелі ў машыне лідэра гурта Яўгена Салдаценкі, і я дзяліліся з ім ідэяй: два чалавекі — самотныя. Яны жывуць у адным горадзе, лад іх жыцця вельмі падобны. І ў рэшце рэшт яны заўважаюць адзін аднаго ў вокнах насупраць..."

Галоўную ролю ў кліпе выканала актрыса Маскоўскага мастацкага акадэмічнага тэатра **Наталля Вянцілава.** Пра суму ганарару, які атрымала актрыса, стваральнікі кліпа сціпла маўчаць. Аднак Аляксандра Бутар адзначыла, што праца расіянкі абышлася ім "дорага".

"Для таго каб належным чынам заплаціць Вянцілавай, нам нават прыйшлося адмовіцца ад некаторай тэхнікі. Але я ўпэўнена, што вынік сябе апраўдаў. Бо, калі я ўбачыла фотаздымак Наталлі, то адразу зразумела, што здымацца павінна яна".

Сам кліп быў зняты за адзін дзень. Для таго каб ажыццявіць "мокрую гісторыю", на выканаўцаў роляў у кліпе, на супрацоўнікаў здымачнай групы было выліта восем тон вады... Ніхто не пацярпеў...

У бліжэйшых творчых планах "Лекарства от меланхолии" — сумесны канцэрт з гуртом ***DaVinci***. Ён адбудзецца 26 мая ў клубе-рэстаране "Гудвін".

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ЗАНАВЕС

«Уйдут» ли Луценко?



В театральных кругах ходят слухи, что в Министерстве культуры активно подыскивают замену художественному руководителю Русского драматического театра имени М.Горького ***Борису Луценко.***

16 сентября Луценко будет праздновать свое 70-летие. Специально к дню рождения режиссера в театре запланирована неделя спектаклей в его постановке и большой творческий вечер, после которого, как предполагают некоторые, Бориса Ивановича красиво "уйдут".

Главным претендентом на должность главрежа Русского театра называют ***Виталия Барковского*** *— нынешнего худрука Национального академического театра имени Я.Коласа.*

"Народная воля" поинтересовалась у Барковского, готов ли он сменить место работы?

— Сплетни о том, что меня могут назначить вместо Луценко, я слышал, — *сказал Виталий Михайлович.* — Но говорить можно о чем угодно — никаких официальных предложений ко мне не поступало.

— Ну а если Вам все-таки предложат сменить место работы, Вы согласитесь?

— Пожалуй, да. Ведь все новое всегда интересно. Но снова повторюсь: официального предложения не было.

— Допустим, что оно уже Вам поступило. Что бы Вы в первую очередь изменили в организации творческого процесса?

— Без каких-то организационных изменений наверняка не обошлось бы. Я считаю, что нужно организовать работу коллектива так, чтобы всех все устраивало. На мой взгляд, не стоит бояться экспериментировать — просто нужно действовать. Скорее всего я поступил бы по примеру Табакова. Он приглашает в свой театр тех режиссеров и актеров, которые уже успели заявить о себе, как о профессионалах в театральном деле. Это хорошо действует...

— Виталий Михайлович, а над чем Вы работаете сейчас?

— Последняя премьера нашего театра — спектакль "Поздняя любовь" по пьесе Островского. Эта постановка посвящена 90-летию со дня рождения народного артиста СССР, лауреата БССР **Федора Шмакова.** На спектакль ушло много энергии и сил. Но в планах еще большое количество проектов...

ЗВОНОК В РУССКИЙ ТЕАТР

В разговоре с журналистом "Народной воли" ***Борис Луценко*** *сказал, что сейчас работает над постановкой спектакля по произведению Владимира Короткевича "Сівая легенда". Слухи о том, что осенью в театре появится новый худрук, Бориса Ивановича сильно удивили. Однако разговаривать на эту тему он не захотел...*

Дмитрий БОБРОВСКИЙ.

КИНОВЕСТИ

В Минск привезли Кшиштофа Краузе

В столичном кинотеатре "Центральный" начался зарубежный киномарафон.

Сейчас в кинотеатре представляет фильмы Польский институт. Как сказали бы кинопрокатчики, кинопрограмма не новая, отработанная, но тем не менее малоизвестная белорусскому зрителю. Даты выхода фильмов помечены 2000—2004 годами.

Открыл кинопоказ фильм "Долг", поставленный одним из самых титулованных режиссеров Польши **Кшиштофом Краузе**. На родине его называют великим профессионалом, умеющим делать социальное кино высокого достоинства. Кроме того, Краузе славится открытием актеров, которые быстро становятся кумирами публики.

"Долг" отмечен "Золотыми Львами" на национальном кинофестивале в Гдыне за лучший фильм и лучшую мужскую роль (Анджей Хыра), а также "Орлами" на Варшавском смотре за лучший фильм, лучшую режиссуру и лучшую главную мужскую роль (Роберт Гонера). В аннотации на фильм "Долг" фигурируют такие понятия, как контракт, банк, кредит, проценты — коллизии касаются сферы бизнеса. А там, где оперируют финансами, страсти нередко накалены и кинематографисту есть за чем понаблюдать.

Жертва во имя спасения мира — такова тема фильма "Ангелус" **Леха Маевского.** Режиссеры **Рышард Брыльски** и **Яцек Борцух** исследуют в своих фильмах "Журек" и "Тюльпаны" отношения в семье.

Четыре фильма, конечно, не могут развернуть панораму польского кинематографа первых лет нового века, но каждая программа такого рода приплюсовывается к нашему прежнему знанию, пополняя его новыми именами режиссеров, актеров, давая возможность постепенного узнавания феномена под названием *польское кино.* В Польше, между прочим, смотрят свое кино, которое не так уж и плохо соперничает с американским. Причина? Умная протекционистская политика государства. В национальное кино вкладывается полтора процента доходов телеканалов, кинопрокатчиков и продаж DVD-дисков и видеокассет. Не так много, как, допустим, во Франции (там пять процентов), но все же... Хватает ежегодно по крайней мере на три десятка фильмов, среди которых много дебютов. Молодая поросль польского кинематографа подпитывается мощной плеядой патриархов — **Анджеем Вайдой, Ежи Кавалеровичем**, пришедшими за ними **Ежи Гоффманом, Кшиштофом Занусси, Феликсом Фальком** и другими мэтрами, с творчеством которых, будем надеяться, мы еще встретимся.

Алла БОБКОВА, кинокритик.

СЛЫШАЛИ?

Андрей Курейчик понравился Марату Башарову

Как молодой и талантливый сценарист.

Один из самых известных молодых российских актеров **Марат Башаров** будет сниматься в новом фильме по сценарию белорусского драматурга **Андрея Курейчика.** Окончательная договоренность об этом на днях была достигнута между актером и продюсером фильма **Ренатом Давлетьяровым**.

Фильм имеет рабочее название *"Юленька. Зло".* Это психологический триллер. По словам продюсера, ничего более пугающего и леденящего кровь он не читал.

Стоит отметить, что ради роли в триллере Андрея Курейчика **Марат Башаров** отказался от целого ряда предложений.

По сценарию герою Башарова предстоит столкнуться с самым неожиданным воплощением чистого зла на земле. Кроме Марата в фильме будут сниматься и другие известные артисты, однако их имена пока не разглашаются.

Ожидается, что это будет один из самых высокобюджетных триллеров.

Снимать фильм будет известный режиссер **Александр Стриженов.** Опыт предыдущего сотрудничества **Андрея Курейчика** и **Александра Стриженова** был более чем удачным — недавно вышедшая на экраны комедия *"Любовь-Морковь"* заработала в прокате СНГ более 13 миллионов долларов США, став самой прибыльной комедией российского кино.

На этот раз сценарист и режиссер намерены доказать, что они не менее успешны и в совершенно противоположном жанре.

Съемки фильма будут проходить в Ялте этим летом, а премьера намечена на начало 2008 года.

Александра БОРИСОВА.

ТУСОВКА

Лариса ГРИБАЛЕВА:

«В Беларуси живет очень много красивых и успешных людей...»

В сентябре уже во второй раз будет определен рейтинг самых красивых, успешных и уверенных в себе людей Минска "Топ-50".

О том, как можно стать участником "Топ-50", "Народная воля" попросила рассказать генерального директора проекта певицу Ларису Грибалеву.

— Лариса, существуют ли какие-то определенные требования к участникам проекта?

— Нет. Мы не придерживаемся параметров 90—60—90. Наш девиз — слова Чехова: в человеке должно быть все прекрасно: и душа, и тело. Человек может одеваться просто, но стильно. При этом можно попасть в заветную пятидесятку. Просто нужно доказать, что вы не просто красотка или жена мужа, а действительно успешный человек.

— В прошлом году уже был составлен список красивых и успешных. Эти люди смогут снова принять участие в проекте?

— У нас не будет совпадений. Будут другие кандидатуры. Возможно, мы увидим людей, которые попали в "Топ-50" в прошлом году, но они не будут победителями. По нашим правилам, один и тот же человек не может два года подряд получить награду.

— А наберется ли в Минске еще 50 красивых и успешных?

— Да, наберется. Уже есть много желающих попробовать свои силы в данном проекте.

— Значит, проект "Топ-50" пользуется популярностью?

— Думаю, что о большой популярности говорить пока рано. Проект существует только второй год. Но определенный интерес к "Топ-50" наблюдается.

— Интересно, в минувшем году были обиженные, кто-то жаловался, например, на необъективность судейства?

— Лично мне никто не жаловался. А если жаловались за глаза, так недовольных у нас по любому поводу масса.

— Лариса, а как вообще возникла идея проведения "Топ-50"?

— Идея придумана не нами. Подобная акция проходит в Москве. К тому же журнал "People" выбирает Топ-100 самых красивых людей мира. Вот мы и решили сделать собственный проект, похожий на уже существующие аналоги. Ведь в Беларуси живет очень много красивых, интересных и успешных людей.

— А почему тогда в проекте могут принимать участие только минчане?

— Мы не ставим перед собой каких-то глобальных целей и задач. Просто решили потусоваться с теми, кто живет в столице и чего-то уже добился в жизни.

— В первый "Топ-50" попало одинаковое количество мужчин и женщин. Так было задумано?

— Мне по этому поводу задавали много вопросов... Это вышло совершенно случайно. Хотя заявок от представительниц прекрасного пола поступило на порядок больше.

— Что нового будет в конкурсе в этом году?

— Поменяется состав жюри. Помимо основных номинаций будет еще несколько дополнительных призов — специально для мужчин и для женщин. Но самое главное изменение заключается в том, что в этом году каждый сможет прислать заявку на участие в "Топ-50".

— И что для этого нужно?

— Нужно просто написать обо всех своих успехах и достижениях, и прислать фотографию, сделанную профессиональным фотографом.

— А как проходит голосование?

— В состав жюри входят известные фотографы, стилисты, специалисты в области моды и красоты, журналисты, модельеры, художники. Голосование проходит открыто.

Сначала каждый из экспертов представляет "десятку", по его мнению, самых красивых и успешных людей Минска. Все индивидуальные "Топ-листы" собираются воедино, затем из этого большого списка отбирается "Топ-50". Выбор делается путем анкетного голосования членов жюри. Определяющим фактором является популярность, публичность и интерес средств массовой информации к той или иной персоне. Стоит отметить, что в "Топ-50" отсутствует рейтинг: участник попадает в финал без определения его позиции в нем.

"Топ-50" красивых и успешных людей Минска 2007 года будет определен на голосовании экспертов проекта в сентябре. Награждение номинантов пройдет в октябре 2007 года в рамках закрытой вечеринки в одном из лучших клубов столицы.

Дмитрий БОБРОВСКИЙ.

К сведению

Заявка на участие в проекте "Топ-50" принимается по адресу: info@dolce-vita.by, либо 220030, г.Минск, пр.Независимости, д.11, к.2, оф.501 "Праздничное бюро Ларисы Грибалевой".

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Ігар ВАРАШКЕВІЧ: «Мы спяваем не тое, што вакалісты аркестра Фінберга...»

Два месяцы перамоў наконт правядзення канцэрта з клубам "Nightstar" скончыліся для гурта "Крама" нічым. Па словах лідэра гурта **Ігара Варашкевіча**, адміністратары клуба проста цягнулі час, не даючы ніякай афіцыйнай паперы: *"Прапанавалі зрабіць праслухоўванне, скласці камісію, як у часы СССР. А ўсё таму, што спяваем па-беларуску і не тое, што спяваюць вакалісты аркестра Фінберга".*

Адміністратар гурта "Крама" Павел Кашырын, які займаўся перамовамі, паведаміў, што канчатковае рашэнне было прынята клубам пасля нейкага званка з вышэйшых інстанцый.

"Мы можам толькі здагадвацца, хто гэта мог быць, — кажа Павел, — *але дакладна вядома, што ідэолагі з Мінгарвыканкама, якія праслухоўвалі альбом, палічылі, што наша музыка мае нізкі мастацкі ўзровень. Зараз мы шукаем іншую пляцоўку для канцэрта. Але дзе адбудзецца канцэрт, пакуль не магу сказаць..."*

Паўліна ВОЙЦІЧ.

ТЫМ ЧАСАМ

Генадзь КУРБЕКА: «Да мяне ніхто не звяртаўся...»

Днямі ў "Народную волю" патэлефанаваў начальнік Упраўлення ідэалагічнай працы **Генадзь Курбека.** Ён сказаў, што не мае ніякага дачынення да ўсёй гэтай сітуацыі.

"Ніхто да мяне не звяртаўся, — паведаміў Курбека. — *І мы нікому ў правядзенні канцэрта не адмаўлялі. Нас спрабуюць абвінаваціць у тым, да чаго мы проста не маем ніякага дачынення".*

ВНЕ ИГРЫ

Болгарский перевал

28 мая футболисты национальной сборной Беларуси соберутся вместе на тренировочный сбор, а 2 и 6 июня проведут отборочные матчи Евро-2008 с командой Болгарии, соответственно в Минске и Софии.

Кандидаты на игру уже известны. Это: **вратари** — Юрий Жевнов ("Москва", Россия), Василий Хомутовский ("Томь", Томск, Россия), Владимир Гаев ("Черноморец", Одесса, Украина), Антон Амельченко ("Москва", Россия;); **защитники** — Сергей Штанюк ("Луч-Энергия", Владивосток, Россия), Александр Юревич ("Шахтер", Солигорск), Артем Челядинский ("Металлург", Запорожье, Украина), Артем Радьков (БАТЭ, Борисов), Сергей Омельянчук ("Ростов", Ростов-на-Дону, Россия), Ян Тигорев ("Металлург", Запорожье, Украина), Павел Пласконный ("Шахтер", Солигорск), Алексей Панковец ("Харьков", Украина); **полузащитники** — Владимир Корытько ("Черноморец", Одесса, Украина), Тимофей Калачев ("Ростов", Ростов-на-Дону, Россия), Александр Кульчий ("Томь", Томск, Россия), Олег Страханович ("Каунас", Литва), Денис Ковба ("Крылья Советов", Самара, Россия), Александр Глеб ("Арсенал", Лондон, Англия), Виталий Булыга ("Томь", Томск, Россия); **нападающие** — Виталий Кутузов ("Парма", Италия), Сергей Корниленко ("Днепр", Днепропетровск, Украина), Вячеслав Глеб (МТЗ-РИПО, Минск), Геннадий Близнюк (БАТЭ, Борисов), Роман Василюк ("Гомель").

Чем же порадует белорусская сборная родных болельщиков в Минске? На мой взгляд, все будет зависеть от того, насколько оптимальный состав соберет главный тренер белорусской команды Юрий Пунтус.

Сегодня, по словам Юрия Иосифовича, в этом плане не все нормально. На мартовском сборе в Руйте получил перелом скуловой кости Артем Концевой, и сейчас ему предстоит повторная операция в Германии. Не увидим мы в сборной Леонида Ковеля, которого делегировали в "молодежку". Проблемы со здоровьем у нашего "итальянца" Виталия Кутузова, после завершения сезона в Англии отправился на обследование в Германию Александр Глеб — дает о себе знать ранее прооперированное колено.

В любом случае понятно, что легкой жизни даже в родных стенах белорусам никто не гарантирует. За опытную болгарскую сборную выступают Радостин Кишишев ("Чарльтон", Англия), Стилян Петров ("Астон Вилла", Англия), Мартин Петров ("Атлетико", Испания), Чавдар Янков ("Ганновер-96", Германия), Димитар Бербатов ("Тоттенхэм", Англия), Владимир Манчев ("Вальядолид", Испания)... Болгары едут в Минск только за победой.

Алесь СИВЫЙ.

Турнирное положение команд

Команда	И	В	Н	П	М	О
1. Голландия	6	4	2	0	8:2	14
2. Румыния	5	3	2	0	10:3	11
3. Болгария	5	2	3	0	7:3	9
4. БЕЛАРУСЬ	**5**	**2**	**1**	**2**	**9:11**	**7**
5. Словения	5	1	1	3	4:8	4
6. Албания	5	0	3	2	3:6	3
7. Люксембург	5	0	0	5	1:9	0

Что было, что будет?

Белорусская сборная провела уже 5 матчей: Беларусь—Албания — 2:2, Голландия—Беларусь — 3:0, Румыния—Беларусь — 3:1, Беларусь—Словения — 4:2, Люксембург—Беларусь — 1:2.

Команде предстоит сыграть еще 7 матчей:
2 июня.
Беларусь—Болгария;
6 июня.
Болгария—Беларусь;
8 сентября.
Беларусь—Румыния.
12 сентября.
Словения—Беларусь.
13 октября.
Беларусь—Люксембург.
17 ноября.
Албания—Беларусь.
21 ноября.
Беларусь—Голландия.

ТЕМ ВРЕМЕНЕМ...

Экс-капитан белорусской сборной Сергей Гуренко отказался от приглашения в команду

— Предварительно договорились по телефону с Гуренко о встрече в Москве, — рассказал корреспонденту "Прессбола" главный тренер сборной Юрий ПУНТУС. — Побеседовать же удалось в самолете, когда после матча возвращались вместе из Москвы в Минск — футболистам "Локомотива" предоставили два выходных. Разговор получился мужским, откровенным. Сергей заметил, что из интервью в прессе его неправильно поняли: сказанное им отнюдь не значит, что он не верит в нынешнюю сборную. Я же в свою очередь подчеркнул, что личные отношения, как бы они ни складывались, не должны вредить общему делу, интересам главной команды страны. По игре Гуренко, несомненно, заслуживает выступать за сборную, в которой к тому же является одним из лидеров. А раз так, ему надо дать право защищать честь национальной дружины. Поэтому, чтобы совесть моя была чиста, я предложил Сергею продолжить выступления в сборной уже в июньских матчах с болгарами. При этом заметил: если по каким бы то ни было причинам он отклонит приглашение, отнесусь к его мнению с пониманием. Гуренко ответил, что для принятия решения ему нужно несколько дней. Позже в телефонном разговоре, поблагодарив за предложение сыграть за сборную, он тем не менее отказался. Сергей сказал, что по окончании минского матча со словенцами он уже попрощался с болельщиками. Что ж, это его выбор, который я принимаю. Желаю ему успешных выступлений в клубе!

КОРАТКА

Кабаева да Беларусі не даехала...

Замест удзелу ў спаборніцтвах па мастацкай гімнастыцы ў Мінску алімпійская чэмпіёнка займалася "актыўнай грамадзянскай дзейнасцю".

Днямі ў Мінску прайшоў турнір Гран-пры па мастацкай гімнастыцы "BelSwiss-Bank. Удзел у ім узялі грацыі з Беларусі, Украіны, Польшчы, ЗША, Балгарыі, Расіі і іншых краін.

Самай галоўнай сенсацыяй турніру стаў непрыезд у беларускую сталіцу алімпійскай чэмпіёнкі расіянкі Аліны Кабаевай. Хаця ўдзел Аліны ў мінскіх спаборніцтвах шырока анансаваўся.

Па інфармацыі арганізатараў, Кабаева нават заказала сабе білеты ў беларускую сталіцу, аднак у апошні момант спартсменка перадумала. Пра гэта паведамляецца ў прэс-рэлізе, які распаўсюдзілі арганізатары мінскіх спаборніцтваў: "Выбарчы падыход алімпійскай чэмпіёнкі да спаборніцтваў эксперты звязваюць з вялікай грамадскай нагрузкай Аліны Кабаевай. Аліна Маратаўна лічыцца членам вышэйшага савета партыі "Единая Россия", членам прэзідыума агульнарасійскай грамадскай арганізацыі "Российский спортивный союз молодежи", а таксама ўваходзіць у склад іншых урадавых і грамадскіх арганізацый Расіі. Акрамя таго, Аліна Кабаева актыўна здымаецца ў кіно, прымае ўдзел у разнастайных тэлевізійных ток-шоу.

Дарэчы, Кабаева адмовілася ад удзелу ў двух этапах Кубка свету. Пад пытаннем яе ўдзел у бліжэйшым чэмпіянаце Еўропы.

Агент Мезіна падаў у суд на Федэрацыю хакея Расіі

Па інфармацыі інтэрнет-сайце www.championat.ru, агенты трох галкіпераў клубаў расійскай Суперлігі (беларуса Андрэя Мезіна, казахстанца Віталя Ярамеева і ўкраінца Канстанціна Сімчука) падалі ў суд на Федэрацыю хакея Расіі. Патрабаваннем галкіпераў, якія маюць на руках расійскі пашпарт, але выступаючых за іншыя зборныя, з'яўляецца знятце з іх статуса легіянераў у Суперлізе. Наяўнасць такога статуса прымушае каманды, у якіх выступаюць гэтыя галкіперы, плаціць за іх вельмі і вельмі вялікі падатак.

Гэты падатак, дарэчы, устанавіла год таму Федэрацыя хакея Расіі.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Вячаслаў ХАРАНЕКА:

«Вядучым навін не буду дакладна»

Пасля таго як уладальнік 123 унікальных сілавых рэкордаў Вячаслаў Харанека узяў удзел у тэлевізійным праекце "Зорны цырк", сярод яго прыхільнікаў папаўзлі чуткі аб тым, што беларускі кароль гір прамяняў гіры на тэлевізійную індустрыю. Адны казалі, што Вячаслаў вось-вось з'явіцца на тэлеэкранах у якасці вядучага навін на АНТ, другія з "достоверных" крыніц ведалі, што Харанека здымаецца ў расійскім серыяле ў ролі крымінальнага аўтарытэта...

Правяраць чуткі лепш за ўсё з першых вуснаў. Таму карэспандэнт "Народнай волі" сустрэўся з Вячаславам Харанекам і задаў яму некалькі пытанняў...

— У АНТэшных навінах я не з'яўлюся дакладна, — гаворыць Харанека. — Па меншай меры ў якасці вядучага. А чуткі наконт маёй тэлекар'еры ўсё ж такі маюць пад сабой глебу. Я звярнуўся на адзін з тэлеканалаў з прапановай зрабіць перадачу, у якой прапагандзіраваўся б здаровы лад жыцця. Калі прапанова будзе прынята, то я выступлю ў гэтай праграме ў якасці вядучага. І на ўласным прыкладзе буду паказваць і расказваць людзям аб неабмежаваных магчымасцях чалавечага арганізма.

— Вячаслаў, таксама хадзілі чуткі, што Вы здымаецеся ў кіно ў ролі крымінальнага аўтарытэта...

— Хто гэта прыдумаў? Можа, я трохі падобны на злодзея (Смяецца. — **Аўт.**), але, калі здымацца ў кіно, то мне па натуры бліжэй роля супермэна ці лавеласа... Падчас майго ўдзелу ў "Зорным цырку" да мяне падышоў рэжысёр Аляксандр Яфрэмаў і сказаў, што ў мяне кіношны твар. Таму я і пайшоў на "Беларусьфільм", запоўніў там анкету і стаў на ўлік. Калі спатрэблюся — выклічуць. Пакуль, праўда, прапаноў не паступала.

— Паколькі Вы ўспомнілі пра "Зорны цырк", то не магу не запытацца і пра наступнае. Казалі, што ў Таццяны Бандарчук на праекце былі любімчыкі. Маўляў, "каралева беларускага цырку" няроўна дыхала да Паўла Кежы, які ў рэшце рэшт і перамог...

— Таццяна Мікалаеўна да ўсіх удзельнікаў адносілася роўна. Ніхто ў яе ў любімчыках не хадзіў. І Павел Кежа выйграў гэты праект абсалютна заслужана. Дарэчы, у некаторых газетах пісалі, што на здымачнай пляцоўцы ледзьве не кожны дзень ўспыхвалі раманы... Але гэта пустыя, ні на чым не абгрунтаваныя сенсацыі...

— Рыхтуючыся да сустрэчы, у адной з газет вычытаў, што ў банкіра Юрыя Каштанава быў раман з хатняй гаспадыняй Вольгай Баранскай..

— Ага, там яшчэ напісана, што ён яе ў Францыю вазіў... Я вам скажу, што нічога падобнага не было. Па крайней меры, мне пра гэта невядома. Між іншым, Каштанаў добры і шчодры чалавек. Аднойчы нават усіх удзельнікаў пакарміў вячэрай. З віном...

— Вячаслаў, а ці праўда, што Вы вырашылі завяршыць спартыўную кар'еру і больш рэкордаў ад Вас чакаць не варта...

— Не, гэта не праўда. Апошнім часам я і сапраўды ніякіх рэкордаў не ўстанаўліваў. Берагу сябе — усё ж такі ўзрост... Але ў гэтым годзе планую пайсці на рэкорд. Мінску спаўняецца 940 гадоў, таму на дзень горада паспрабую ўзняць кег з вадой роўна 940 разоў. Зараз актыўна шукаю пад гэта спонсараў. Калі ёсць жаданне дапамагчы — звяртайцеся...

— Пасля таго, як Вы выйшлі на міліцэйскую пенсію, чым зарабляеце на жыццё? А можа, гэтых грошай хапае?..

— Грошай многа не бывае... (Смяецца. — **Аўт.**). Зараз я ўладкаваўся на працу ў Фізкультурна-аздараўленчы комплекс у Сцяпянцы. Разам з маім трэнерам Міхаілам Рабецам выкладаем дзецям агульную фізічную падрыхтоўку, захвочваем іх да гіравога спорту. Акрамя таго, выступаю ў разнастайных начных клубах, у рэстаранах, на вяселлях...

— Ёсць такая катэгорыя артыстаў, якія грэбуюць выступаць перад людзьмі, якія ядуць і п'юць. Атрымліваецца, што Вы да іх не належыце...

— Вядомы тэнар Фёдар Шаляпін, знаходзячыся ў эміграцыі, лічыў абсалютна нармальным выступаць перад людзьмі на абедах. І нічога, ніхто яго за гэта не асуджаў. Я таксама не бачу нічога няправільнага ў тым, каб выступаць перад людзьмі, якія ядуць...

— Колькі каштуе запрасіць Вас, скажам, на вяселле?

— Тры талеркі "Аліўе" і дзве талеркі макароны, бо ў іх вугляводаў многа. Жартую. Усё залежыць ад сітуацыі. Кошт майго выступлення залежыць ад складанасці нумара, які трэба выканаць. Грашовыя пытанні вырашаюцца індывідуальна...

Віталь ГАРБУЗАЎ.
Фота Юрыя ДЗЯДЗІНКІНА.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Улады вызвалілі Севярынца, Статкевіча. Калі дойдзе чарга да «Народнай волі»?

Шаноўныя чытачы!

Памятаеце, што гаварыў на прэс-канферэнцыі Аляксандр Лукашэнка? Што ён не супраць таго, каб "Народная воля" друкавалася ў Мінску.

Амаль два месяцы прайшло, а зрухаў ніякіх. Вызвалілі з "хіміі" Севярынца, Статкевіча, можа, усё ж вернуць з "эміграцыі" і "Народную волю"?

А пакуль блакаду не знялі, дзейнічаем, шаноўныя сябры, так, як і дзейнічалі: друкуемся ў Смаленску, распаўсюджваем газету ўласнымі сіламі. Хто яшчэ не зрабіў **перадаплату** за чэрвеньскія нумары — калі ласка, зрабіце гэта ў бліжэйшыя дні. З такой просьбай рэдакцыя звяртаецца і да тых, хто запазычыўся, г.зн. у маі атрымліваў газету авансам. Шкада, але, калі Вы не падтрымаеце "Народную волю", нам, паўтараем, давядзецца развітацца.

Для тых, хто ўпершыню хоча стаць нашым чытачом, патлумачым: аформіць **перадаплату** можна ў любы дзень. Як толькі нам стане вядома, што Вы заплацілі грошы, праз 2—3 дні атрымаеце свежыя нумары газеты. Таму хутчэй у любы філіял "Беларусбанка" альбо на пошту!

Заадно ў чарговы раз паўтараем нашу настойлівую просьбу: агітуйце за "Народную волю" блізкіх, суседзяў, сяброў па працы, вучобе.

А чаму б не аформіць **перадаплату** за будучыя нумары для таго, каго Вы збіраецеся віншаваць з днём народзінаў ці з нейкай іншай нагоды?

Ведаеце людзей, якія з задавальненнем чыталі б "Народную волю", але, на жаль, у іх цяжкае фінансавае становішча? Калі ласка, дапамажыце ім аформіць **перадаплату**, ваша дабрачыннасць адгукнецца шчырай удзячнасцю ў сэрцах тых, каму Вы зрабілі дабро.

Каб аблегчыць вашы клопаты, і сёння друкуем узоры плацежкі і абаненцкай карткі.

Для тых, хто толькі-толькі вырашыў стаць чытачом "Народнай волі", паведамляем: каб зрабіць **перадаплату** за нумары бягучага і наступных месяцаў (можна нават да канца года), **тэрмінова** наведайце любы філіял "Беларусбанка", а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне. Мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашыя валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм (за тры месяцы адпаведна 28.500 і 45.000 рублёў). Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары. Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для Вас, шаноўныя чытачы, гэта дадатковыя цяжкасці. Але што зробіш: каб Вы своечасова атрымлівалі газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за май,	июнь 2007 г.			
(ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за май,	июнь 2007 г.			
(ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ
Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов

Абонентская карточка
на номера газеты «Народная воля»
за май, июнь 2007 года
(ненужное зачеркнуть)
Заполняется отчетливо ***печатными буквами*** *и* ***обязательно*** *отправляется в редакцию с* ***копией платежного документа***

фамилия
имя **отч.**
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица
пр-т
переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

ЧУЛІ?

Лёс амерыканца залежыць ад канадца

Як вядома, на прайшоўшым у Расіі чэмпіянаце свету па хакеі зборная Беларусі выйграла толькі адну з шасці сваіх сустрэч. Нягледзячы на не самае лепшае выступленне, каманда пад кіраўніцтвам амерыканскага спецыяліста Курта Фрэйзера здолела захаваць месца ў мацнейшым дывізіёне.

Тым не менш сярод балельшчыкаў папаўзлі чуткі, што Курт Фрэйзер немінуча будзе адпраўлены ў адстаўку. Але, як звычайна, хакейныя заўзятары паспяшаліся адправіць амерыканца ў адстаўку. Хаця сапраўды лёс Курта Фрэйзера ў зборнай Беларусі будзе вызначацца ў самы бліжэйшы час. Пра гэта паведаміў генеральны менеджэр нацыянальнай зборнай Святаслаў Кісялёў: *"У першай палове чэрвеня павінен адбыцца выканкам Федэрацыі хакея краіны. На ім трэнерскі штаб зробіць справаздачу аб выступленні нацыянальнай зборнай на чэмпіянаце свету. Што тычыцца далейшага лёсу Курта Фрэйзера на пасадзе галоўнага трэнера каманды, то тут сітуацыя наступная: кантракт з амерыканскім спецыялістам заключаны тэрмінам на адзін год".*

Курт Фрэйзер змяніў на гэтай пасадзе канадца Глена Хэнлана. Пратэкцыю Фрэйзеру рабіў менавіта Хэнлан, які зараз, па дамоўленасці з нашай федэрацыяй хакея, каардынірує працу трэнерскага штаба да алімпійскага 2010 года. Таму лёс Фрэйзера залежыць у тым ліку і ад Глена Хэнлана. *"Дарэчы, зараз федэрацыя хакея праводзіць перамовы з Хэнланам. І верагодна, што пры ўдалым збегу абставін Хэнлан можа зноў стаць ля руля беларускай зборнай на будучым чэмпіянаце свету",* — сказаў Святаслаў Кісялёў.

Нагадаем, што чэмпіянат пройдзе на радзіме Глена Хэнлана — у Канадзе. Сапернікамі беларускай зборнай па адборачнай групе будуць каманды Швецыі, Францыі і Швейцарыі.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

РОЗНАЕ

Для выдання кнігі "Вялікае княства Літоўскае: чаму літоўскае, а не беларускае" запрашаюцца спонсары. **Тэл.8-029-351-16-98.**

Дапамагу абуткам, адзеннем і інш. **Тэл.8-029-757-71-41.**

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 23.05.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №